Са СВЯТАМ!

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Каляднікі ☞ 3

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 02 (2852) Год LVI | Беласток, 9 студзеня 2011 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

КАЛІ ЗАПІШАМСЯ БЕЛАРУСАМІ...?

Ілона КАРПЮК

Неўзабаве сядзем за каляднымі сталамі. Гэта час, які прысвячаем сабе і сваёй сям'і, час доўгачаканых сустрэч, гутарак, успамінаў, а таксама планаў. Каляды гэты таксама час, які ўводзіць нас у новы год. Той, які перад намі, для беларусаў Польшчы можа прынесці важныя змены. Аднак мы самі вырашым, у які бок яны пойдуць.

На стале куцця, боршч, карп у розных варыянтах, капуста з грыбамі і шмат чаго яшчэ. Гэта калядны стол, на якім не павінна не хапаць страў, а за ім — людзей. Калі мы, беларусы, арганізуем сабе святы з блізкімі, таксама можам сарганізаваць сабе будучыню. Наш выбар і магчымасці вызначыць змест пытанняў у ходзе **перапісу насельніцтва 2011 года, які пройдзе з 1 красавіка па 30 чэрвеня.** Адказы на пытанні будзем даваць самі. Але ўжо сёння ў крузе блізкіх асоб можам сесці за адным сталом і запытаць сябе: „Ці і чаму варта запісацца беларусамі?".

З 2007 года некаторыя нашы гміны рэальна пачалі карыстацца законам аб нацыянальных і этнічных меншасцях ды рэгіянальнай мове. Першай беларускую мову ў якасці дапаможнай увяла гарадская гміна Гайнаўка. Пасля далучылі да яе гміны Орля, Нараўка, Чыжы і вясковая гміна Гайнаўка. Больш за 500 мясцовасцей ва ўсёй Польшчы маюць ужо таксама двухмоўныя назвы, але ў іх ліку няма яшчэ беларускіх. Аднак ёсць вялікі шанс, каб неўзабаве з'явіліся яны ў гміне Орля. Дзякуючы нашай актыўнасці ў час перапісу 2002 года такую магчымасць атрымалі 12 гмін Падляшскага ваяводства. Перапіс 2002 года гэта аднак ужо далёкая мінуўшчына. Перад намі будучыня, якую вызначаць вынікі чарговага перапісу. За апошнія восем гадоў шмат што памянялася: з'явіўся закон аб меншасцях, Польшча далучылася да Еўрасаюза, мяняюцца ўмовы жыцця і гаспадарання на вёсцы, гміны пачынаюць самастойна рэалізаваць свае патрэбы, маем штораз шырэйшы доступ да культуры, якая ў сваіх розных відах зазірае ў найменшыя куточкі рэгіёна. Беларуская культура таксама развіваецца. Ёсць месца на традыцыйныя, народныя фэсты, спевы, танцы. Маладыя людзі арганізуюць канцэрты і выстаўкі. Ладзяцца фестывалі для ўсіх пакаленняў гледачоў. Даволі часта можам удзельнічаць у аглядах кінамастацтва нашых мясцовых творцаў, для якіх беларуская тэматыка часта становіцца асновай працы. Арганізуецца Цэнтр адукацыі і прамоцыі беларускай культуры ў Шчытах. Пералік можна працягваць, але найважнейшае, што гэта мы самі сябе забяспечваем. Называючы сябе беларусамі ў ходзе перапісу насельніцтва паказваем, што нас многа і што маем свае патрэбы. Паколькі штодзень кожны з нас жыве сваім рытмам і сваімі справамі, то раз на пару гадоў можам зрабіць таксама нешта для нашай супольнасці.

ПЕРАПІС НА ПРАКТЫЦЫ

Ужо ў студзені ў агульнапольскіх і рэгіянальных каналах Польскага тэлебачання пабачым каля дзевяці розных прамацыйных перадач і грамадскіх рэклам, якія заклікаць будуць нас да актыўнага ўдзелу ў перапісе насельніцтва 2011 года. У прамоцыі будзе ўдзельнічаць таксама Польскае радыё, але толькі ў агульнапольскім эфіры, бо заканадаўца (невядома, выпадкова ці мэтанакіравана) памыліўся і ў законе кепска назваў рэгіянальныя станцыі і такім чынам фінансаваная дзяржавай прамоцыя імі весціся не будзе. Не прадбачаны таксама асобныя сродкі на прамоцыю ў меншасных сродках масавай інфармацыі. Усё ж такі нейкая форма рэкламнай кампаніі пройдзе.

Уважлівы чытач напэўна заўважыў, што ў „Ніве" вельмі дакладна адсочваем падзеі звязаныя з надыходзячым перапісам насельніцтва, пад знакам якога пройдзе першая палова года (пасля, зразумела, эмоцыі выклічуць яго вынікі і паслядоўнасці). Ужо паўгода даносім вам, чытачы, інфармацыю пра перапіс, набліжаем меркаванні вядомых прадстаўнікоў беларускай грамадскасці і звычайных жыхароў Беласточчыны, і спадзяемся, што застанецеся з намі ўвесь даперапісны перыяд. А мы надалей будзем паведамляць пра ўсялякія змены, падключымся да галоўнай плыні прамоцыі, якую арганізуе і гарантуе Галоўная статыстычная ўправа, нягледзячы на тое, што акцыя пачалася з гэтак званага фальстарту....

Падрыхтоўка прамацыйных матэрыялаў пачалася яшчэ ў старым годзе. Прадстаўнікі меншасці даведаліся, што „ёсць ужо рэкламныя формы, накіраваныя да меншасцей, пражываючых у Польшчы". У адным з варыянтаў рэкламы меншасці заахвочваюцца да ўдзелу ў перапісе шляхам прэзентацыі нацыянальных страў на стале, за якім сядзяць асобы без твараў. Мы маем твары, часта вядомыя на ўсю Польшчу, і такія твары беларусаў, татараў, немцаў, украінцаў ды іншых меншасцей варта паказваць без сораму. Ці суп з гарбуза, які на гэтым супольным стале мае характарызаваць беларусаў, сапраўды адлюстроўвае нашу кухню? Ці назва гэтага супу, „тыквеннік", характэрная нам? Дзе бульбяная бабка, драніки, калдуны? І ці сапраўды гэта самы лепшы спосаб заахвочваць меншасці да ўдзелу ў перапісе? Гэта, на шчасце, не адзіная форма рэкламы. Будзе шанс рабіць прапановы для наступных рэкламных ролікаў. А ў тэлеэфіры сустрэнуцца меншасныя журналісты, якія супольна будуць абмяркоўваць пытанні перапісу. Выразна найслабейшай будзе кампанія на радыёстанцыях, паколькі ім застаецца найменш эфірнага часу, але магчыма, што пачуем нацыянальныя мовы побач голасу вядомай польскай дыктаркі Крыстыны Чубуўны (калі Галоўная статыстычная ўправа прафінансуе гэтую ідэю). Выдаўцы меншаснай прэсы змагаюцца пакуль за фінансаванне адмысловых матэрыялаў, якія можна будзе змясціць у паасобных выданнях, але ўжо вядома, што ліст Генеральнага камісара перапісу будзе перакладзены на мовы ўсіх меншасцей, мабыць, з'явяцца таксама ў нашых гмінных управах, дамах культуры, месцах сустрэч плакаты на беларускай мове ў выпадку нашай меншасці, ды іншых мовах, прызнаных законам аб меншасцях. У ліку матэрыялаў рыхтаваных для прамоцыі перапісу апынуцца таксама інструкцыі для самаперапісу. Будзе гэта магчымае на сайтах

http://www.stat.gov.pl
або **http://www.spis.gov.pl**.

Калі ўжо сёння палохае вас сустрэча з інтэрнэтам, варта помніць, што ў нашых сем'ях ёсць дзеці, унукі, блізкія, якія штодзень працуюць пры камп'ютарах і напэўна ад дапамогі не адмовяцца. Такую дапамогу абавязаны будуць забяспечыць таксама гмінныя ўправы. На згаданых сайтах будзе можна пазнаёміцца з лістоўкамі і мультымедыямі, падрыхтаванымі для прамоцыі перапісу насельніцтва 2011 года.

Бліжэйшыя дні правядзем у крузе блізкіх. Неўзабаве прывітаем таксама Новы год. Няхай гэты час змабілізуе нас задумацца над будучыняй нашай і нашых дзяцей. Супольна маем шанс выбраць лепшую будучыню і калі адважымся паказаць колькі нас, беларусаў, пражывае ў Польшчы, гаспадарам краіны цяжка будзе гэтага не заўважаць, а і мы будзем адчуваць сябе гаспадарамі свайго лёсу і ў большай ступені будзем мець шанс вырашаць свае справы самі. Віншуем з Калядамі і Новым 2011 годам!

9 770546 196000

Беларуская салідарнасць

У Мінску і Жодзіне каля трохсот чалавек адначасова мусілі выйсці з астрога. У любой іншай еўрапейскай краіне гэта можна было б растлумачыць толькі адным — у дзяржаве аб'яўлена амністыя. Але ў Беларусі амністыяй і не пахне. У Беларусі працягваюцца арышты, ператрусы, выклікі ў КГБ... А выпускаюць на волю тых людзей, якіх схапілі разам на плошчы ў Мінску 19 снежня падчас жорсткага разгону мірнай дэманстрацыі. Асудзілі іх таксама разам, толькі яшчэ хутчэй, чым пахапалі. А вось адпускаюць паасобку. Людзей садзяць у адмысловыя машыны, возяць па горадзе і вызваляюць невялікімі групамі...

Родныя, блізкія, сябры і аднадумцы затрыманых чакаюць іх там, ля сцен ізалятараў часовага затрымання, дзе тыя адбывалі пакаранне. Але чаканне марнае. Вызваленыя людзі з'яўляюцца то там, то тут, але не там, дзе іх чакаюць. Цяпер, калі яны адседзелі прызначаны судом тэрмін, іх чамусьці вывозяць у невядомым кірунку і высаджваюць з машын там, дзе яны не прасілі. Чаму? Чаму ж іх адразу не выпусціць з вязніцы ў абдымкі сяброў і паплечнікаў? А калі ўжо вывозіць, дык хаця б на тое месца, дзе затрымалі. Хоць нейкая логіка ў тым была б.

Але не. Зроблена ўсё так, каб гэтыя людзі зноў не сталі разам, адзін з другім побач і з аднадумцамі, якія, не зважаючы на маразы, апантаныя рашучасцю дачакацца сваіх сяброў. Зроблена ўсё, каб гэтыя людзі не сустрэліся хаця б у гэты дзень. Зараз, пасля падзей 19 снежня, у беларускім грамадстве ўзмацнілася адна вельмі важная з'ява, якой ва ўладзе не хочуць бачыць. Узмацнілася салідарнасць. Беларуская салідарнасць.

Адразу пасля судоў над удзельнікамі масавай акцыі ў Мінску, у яшчэ дзеючыя офісы апазіцыйных структур пацягнуліся людзі. Яны неслі ежу, сокі, цыгарэты, сродкі асабістай гігіены, вопратку. Усё, што можа спатрэбіцца там, у вязніцы. Яны пыталіся, чым могуць дапамагчы арыштаваным, пакідалі свае тэлефоны, прапаноўвалі звяртацца, калі патрэбная якая дапамога...

Для беларусаў жаданне дапамагчы іншым — з'ява не новая. У найноўшую гісторыю беларусы заўсёды спяшаліся камусьці дапамагчы. І рабілі гэта нашмат часцей, чым дапамагалі нам, прытым нярэдка вельмі рызыкуючы. Напрыклад, беларусаў, якія абаранялі яшчэ ад савецкіх войскаў свабоду ў Вільні, было ў многа разоў больш, чым усіх нашых прыбалтыйскіх суседзяў на ўсіх масавых акцыях у Мінску за ўсе гэтыя гады. І на майдане ў Кіеве, калі Украіна стаяла перад шанцам здабыць свабоду і дэмакратыю, луналі ў знак падтрымкі нашых суседзяў неўміручыя бел-чырвона-белыя сцягі. Іх таксама было там нашмат больш, чым у Мінску сцягоў усіх іншых краін разам узятых. І пікетаў, якія асуджалі знішчэнне мірнага насельніцтва Чачні, у беларускіх гарадах таксама было хіба больш, чым дзе. Памятаю, як нейкія замежныя госці нават спыталіся, якая беларусам справа да тых далёкіх праблем. Але нашы суайчыннікі заўсёды надзвычай востра адчувалі праблемы іншых людзей, іншых народаў, і ніколі не заставаліся абыякавымі да іхных бед. І часамі гэтае бескарыснае, чыстае, вострае жаданне дапамагчы іншым адбывалася за кошт адкладвання сваіх уласных праблем на потым.

Але не гэтым разам. Такой нацыянальнай салідарнасці, якая прачнулася зараз, можа пазайздросціць кожная нацыя. Беларусы самі, без нейкага закліку, пачалі працягваць руку дапамогі тым суайчыннікам, якія ў бядзе. Пачалі рабіць гэта, не просячы ні ў каго больш дапамогі. Нібыта нічога нам больш ад іншых не трэба. Абы не прадавалі нас больш. І тое добра. І за тое дзякуй.

Праўда, ёсць і такія нашы суайчыннікі, якія высочваюць, шукаюць, даносяць... Возяць людзей па горадзе, каб іх не сустрэлі сябры... Проста, у гэты Навагодні і Калядны час хочацца згадаць пра лепшае. Хочацца гаварыць і пісаць пра тых беларусаў, дзякуючы якім наша грамадства ўваходзіць у Новы, 2011 год, як з абвостраным пачуццём свабоды і справядлівасці, так і з узмоцненым пачуццём нашай беларускай салідарнасці. І, па хрысціянскай звычцы, не забыцца, што святочныя дні нехта сустракае за кратамі.

Віктар САЗОНАЎ

Дзе пашана да людзей?

У рыначнай эканоміцы лічацца адно грошы. Кожнае прадпрыемства, дзяржаўная ўстанова ці прыватны прадпрымальнік намагаецца іх здабыць як мага больш. Няважна якім спосабам — законна, ці ашуканствам. Асноўнае, каб найбольш накапіць. Прыкладаў са штодзённага жыцця — хоць адбаўляй. Першы з боку — чыгунка. Даўней казалі, што на чыгунцы работнікі працуюць паводле прымаўкі: „Czy się stoi, czy się leży tysiąc złotych się należy". Чыгуначнікі не дбалі пра маёмасць і вынікі працы. Прыватызацыя мела адмяніць сітуацыю і вылучыць сапраўднага гаспадара адказнага за парадак на прадпрыемстве. Такім чынам з васьмі акруговых дырэкцый ПКП арганізавалі дваццаць тры суполкі. Кожная суполка лічыцца зараз прадпрыемствам, у якім вылучаны моцныя структуры адміністрацыі. Чарговыя рэструктурызацыі не далі прыбытку ў карысць прадпрыемства, як быць павінна ў рыначнай эканоміцы, толькі ў карысць вярхушкі. Гэта чыноўнікам, а не рабочым, прызначаліся высокія зарплаты і прэміяльныя. І ўсё было „о'кей", калі плыў паток грошай з казённай касы. Калі паменшыліся датацыі з дзяржаўнага бюджэту, тады кіраўнікі суполак пачалі збываць усё, што пад руку папала. На першы пачатак пачалі абмяжоўваць штаты рабочых. Затым пайшла маёмасць. Суполка чыгуначнай маёмасці, напрыклад, лічыць, што туалеты на станцыях і прыпынках (таксама лаўкі для сядзення на перонах) непатрэбныя. Яны гэтым не карыстаюцца. Паступіў загад забраць лаўкі. Так было і з туалетамі. У Кляшчэлях, напрыклад, разабралі мураваны туалет збудаваны пэўна пры царскім парадку. Кажуць, што і ў Сямятычах на станцыі падарожныя маюць праблему з задавальненнем фізіялагічнай патрэбы. А што з залямі чакання? Новазбудаваныя станцыі ў Бельску-Падляшскім і Гайнаўцы палохаюць падарожных. У Бельску, напрыклад, прыватны прадпрымальнік арганізаваў у чыгуначнай кацельні склад керамічнай пліткі. Зала чакання неабагрэтая. Працаўнікі білетных кас ПКС, якія арандуюць памяшканні ў Прадпрыемстве чыгуначнай маёмасці, абаграваюцца электрычнымі печкамі. А падарожныя мерзнуць. Не лепш справа маецца ў Гайнаўцы. Пацвердзілі гэта пенсіянеры-чыгуначнікі Міхась Зіневіч з Чаромхі і Міраслаў Кадлубоўскі з Бельска-Падляшскага, з якімі падарожнічаў я 29 снежня ў Беласток.



Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

І яшчэ адна справа. Ад 16 снежня пачалася акцыя выкупу ільгот на праезды чыгуначным транспартам. Раней „значок" можна было купіць у білетнай касе на станцыі ў Чаромсе, Беластоку ці Гайнаўцы. Зараз пенсіянеру трэба целяпацца ў Беласток. Ды і там праблемы. У адным месцы запаўняеш бланк, затым кажуць ісці на пошту і плаціць грошы, а пасля з квітанцыяй вярнуцца назад, і толькі тады атрымаеш дакумент. Паколькі аб гэтым ніхто раней не паведаміў чыгуначнікам, дык пры канцы года збіраецца шмат людзей, выстройваюцца чэргі. А дакументы афармляе адна чыноўніца. Пенсіянер траціць надарэмна нервы і час. Ці нельга было б вызначыць дадатковага працаўніка, каб паскорыць працу? Няўжо гэта складаная справа? Па-мойму, усё гэта спрычыняецца да балагану і мітусні на чыгунцы. Таму хочацца паставіць пытанне ў адрас кампетэнтных чыноўнікаў Міністэрства інфраструктуры: дзе пашана да людзей, дзе пашана да закону?

Уладзімір СІДАРУК

Вачыма еўрапейца

Чэргі па візы?

Гэтая інфармацыя — адна з найважнейшых, якія паявіліся ў СМІ ў Польшчы: беларусы ад гэтага года могуць прыязджаць у нашу краіну, пакарыстаўшыся бясплатнымі візамі. Прэс-сакратар МЗС Марцін Басацкі выказаўся ад імя міністра Радаслава Сікорскага наступным чынам: „Гэта знак салідарнасці і прызнання беларускаму народу, які ў час выбараў 19 снежня выслаў моцны сігнал падтрымкі дэмакратычных рухаў. Хочам дапамагчы нашым суседзям ва ўзмацненні еўрапейскай самасвядомасці шляхам часцейшых кантактаў з палякамі і іншымі грамадзянамі Еўрасаюза. Кошт краёвай візы складаў дагэтуль 20 еўра. Ад пачатку 2010 тода тры польскія консульскія ўстановы (Брэст, Гродна, Мінск) выдалі 172 496 віз грамадзянам Беларусі. Доўгачасовыя краёвыя візы выдаюцца пераважна звычайным грамадзянам, а не прадстаўнікам улад. Адначасова пакідаем за сабою права на крокі, якія прадухіляць уезд на тэрыторыю РП чыноўнікаў і грамадзян Рэспублікі Беларусь адказных за арганізаванне хвалі рэпрэсій супраць адкрытага грамадства з 19 снежня 2010 года".

Зараз пасля гэтага рашэння паявіліся першыя каментарыі польскіх палітыкаў. Віцэ-старшыня сеймавай камісіі замежных спраў Роберт Тышкевіч проста эйфарычна заявіў у размове з Радыё Рацыя:

— Гэта пераломнае рашэнне. Цешуся, што Польшча як першая краіна рашылася на такі прыём. Гэтае рашэнне напэўна ажывіць гандлёвы абмен у памежным рэгіёне, паправіць стасункі паміж палякамі і беларусамі.

Я, аднак, падыходжу да рашэння шэфа МЗС у Варшаве з меншай эйфарыяй. Уяўляю сабе як прадстаўнікоў рэжыму Аляксандра Лукашэнкі, так і звычайных выбарцаў, якія яго падтрымліваюць, калі цешацца і кажуць: „Зноў палячкі пакрыкваюць штосьці аб адсутнасці дэмакратыі ў нашай краіне, а нашы грамадзяне толькі ў выйгрышы ад таго, што робіць наш Бацька".

Аднак, больш сур'ёзна, варта прыслухацца таму, што аб увядзенні бясплатных віз гавораць самі прадстаўнікі беларускай апазіцыі, скажам, Аляксандр Мілінкевіч:

— Краёвыя візы атрымаюць цяпер асобы, якія ўязджаюць у Польшчу на даўжэйшы час: на паўгода, напрыклад, на працу або на стажыроўку. Калі выезд карацейшы ці шматразовы, трэба хадайнічаць за шэнгенскую візу, нават калі мэтай выезду з'яўляецца толькі Польшча. Па гэтай прычыне, калі б да гэтага рашэння [Радаслава Сікорскага — М. Х.] далучыць адмяненне тэрміну прабывання, быў бы гэта агромны крок для беларусаў, якія маглі б свабодна, на столькі дзён, колькі хочуць, ездзіць з візітамі ў Польшчу на аснове польскіх віз.

Тут, аднак, Марцін Басацкі запэўніваў, што калі толькі беларусы схочуць наведаць сям'ю ў Польшчы або часта прыязджаць да нас у турыстычных мэтах, таксама атрымаюць краёвыя візы бясплатна. Веру ў словы пана Басацкага, але ўжо бачу скандалы ў польскіх консульствах у Беларусі, як усчынаюцца спрэчкі, бо нейкі польскі чыноўнік не хоча выдаць бясплатнай візы, а толькі шэнгенскую за — дробязь — 60 еўра. Ну і яшчэ можна паставіць пытанне: ці польскія консульствы ўвогуле падрыхтаваныя да афармлення вялікай колькасці заяў на краёвыя візы?

Спасылаючыся таксама на камюніке МЗС, з нашых неафіцыйных інфармацый вынікае, што г.зв. новы чорны спісак ахопіць пару дзесяткаў асоб непажаданых у Польшчы. У гэты раз датычыць ён будзе таксама найбліжэйшай сям'і палітыкаў, суддзяў і іншых працаўнікоў апарату рэпрэсіі. І яшчэ адно. Па маёй ацэнцы, у кантэксце апошніх падзей у Беларусі, можна спытацца пра канчатковую ратыфікацыю польска-беларускай дамовы аб малым памежным руху. У гэтым кантэксце працягваецца пакуль што маўклівае чаканне абодвух бакоў.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

(працяг з папярэдняга нумара)

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

СВЯТЫ З ТРАДЫЦЫЯМІ І ПА-СУЧАСНАМУ (ч.2)

Калектыў Гайнаўскага дома культуры з прыгожай звёздачкай удала калядаваў на сцэне. Жанчыны і мужчыны ад імя гайнаўскіх прыходаў калядуюць таксама па дамах і кватэрах у блоках

Калі гаворым пра Ражджаство Хрыстовае, некаторыя пачынаюць успамінаць Куццю, у час якой захоўваліся даўнія традыцыі і народныя вераванні. Супольная вячэра з дзяцьмі і ўнукамі гэта і цяпер радасная сустрэча, тым болей што адбываецца напярэдадні вялікага свята. Аднак цяперашняя Куцця ў некаторых праваслаўных сем'ях, калі ўручаюцца падарункі, а на сталах паяўляецца нават няпоснае харчаванне, гэта ўжо не традыцыя нашых продкаў, якія не расцягвалі спажывання куцці і іншага поснага харчавання, толькі хутчэй рыхтаваліся да сну, каб адпачыць яшчэ перад усяночнай.

Як святкавалі і святкуем

У нашай традыцыі сямейная сустрэча з дзяцьмі і ўнукамі адбывалася на першы або другі дзень Ражджаства Хрыстовага за скаромным сталом і тады сямейнікі спявалі калядкі. На першы дзень святаў дзеткі ішлі калядаваць па сваёй, а бывала што і па суседніх вёсках, а моладзь спатыкалася ў кампаніі, каб адвячоркам таксама пайсці славіць Хрыстовае Нараджэнне.

— Перад вайной непрымальнымі былі вялікія сямейныя сустрэчы ў час Ражджаства Хрыстовага і не наведвалі тады сваіх хроснікаў, бо ім давалі падарунак толькі адзін раз у год — „валачэбнае". Аднак бывала, што замужнія дочкі, ці жанатыя сыны, асабліва з суседніх сёлаў, прыязджалі наведаць сваіх бацькоў. Гасцяванне на Ражджаство маладых сямействаў, якія сябравалі з сабой, пачалося ўжо пасля вайны. Канешне, бывала і перад вайной, што мужчыны спатыкаліся ў сваёй кампаніі і гасцявалі, але гэта былі рэдкія выпадкі. Затое асобна спатыкалася старэйшая і малодшая моладзь, калядавалі яны, а пасля святаў маліліся на заказной літургіі, гасцявалі і ладзілі танцы, — расказвала спадарыня Марыя з Гайнаўшчыны.

— Нават і пасля вайны дзеці найчасцей прыязджалі да сваіх бацькоў і спатыкаліся са сваімі сваякамі ў час прыхадскіх фэстаў і тады гасцявалі, а ў час Ражджаства Хрыстовага найчасцей вялікіх гасцінаў не ладзілі, — заявіў айцец Яўгеній Падгаецкі са Свята-Троіцкага сабора ў Гайнаўцы.

Частае гасцяванне ў час зімовых святаў прынялося разам з больш масавым перамяшчэннем вясковага насельніцтва ў гарады і ад гэтага часу гарадскія пачалі таксама прыязджаць да сваіх бацькоў на Куццю. Цяпер частка дзяцей прыязджае да сваіх бацькоў на вёскі на першы дзень святаў, пабываючы на ўсяночнай багаслужбе ў гарадскіх цэрквах. Пасля гасцявання, сямейных бясед і спявання калядак, познім вечарам дзеці і ўнукі ад'язджаюць дамоў або начуюць і на другі дзень вяртаюцца ў гарады. У прыходзе маіх бацькоў у Новым Беразове хіба часцей гарадскія распачынаюць святкаванне са сваімі бацькамі з першага дня Божага Нараджэння і ад'язджаюць ноччу ў гэты сам дзень, каб на другі дзень святкавання памаліцца ў гарадской царкве або ў прыходзе цесцяў, разам з імі пагасцяваць або наведаць хроснікаў. Дзеткі вяртаюцца ад бабуляў радасныя і са шматлікімі падарункамі. Апошнім часам паявілася мода даваць падарункі дарослым. Аднак, наведваючы сваіх блізкіх і раздзяляючы з імі радасць ад Нараджэння Хрыстовага, трэба таксама пільнавацца, каб свята не прыкрыла спажыванне вялікай колькасці смакоццяў і мацнейшых напояў.

Калядуем па хатах і на сцэне

— У нас яшчэ мнагавата дзетак калядавала, а былі таксама каляднікі са звёздачкамі. Вечарам калядаваў наш бацюшка з псаломшчыкам і малодшымі спевакамі з царкоўнага хору, бо ў нас па ўсім прыходзе калядуюць з мэтай сабраць грошы на абсталяванне царквы або на яе рамонт, — гаварылі ў мінулым годзе жыхары Новага Беразова.

Два гады таму і раней сам я слухаў калядкі ў выкананні новаберазоўскіх дзетак. Мала з іх жыве ўжо ў асноўнай частцы Беразова. Пераважна насяляюць яны дамы і блок былога пэгеэра і мяркуецца, што састаўляюць яны прыблізна палову вучняў Падставовай школы ў Новым Корніне. У суседніх вёсках Гайнаўскай гміны таксама можна спаткаць каляднікаў, хаця ўжо хіба не так многа, як у Беразове. На поўдні Гайнаўскага павета калядуе яшчэ менш дзетак і моладзі, але затое там захавалася традыцыя спявання вельмі даўніх калядак маладжонам і нованароджанаму дзіцяці, нават калі яно жыве з бацькамі ў горадзе, а ў дзень Ражджаства Хрыстовага наведае сваю бабулю. Гэтыя даўнія, свецкія калядкі не спяваюцца ўжо па сёлах бліжэй Гайнаўкі.

— У Бельску калядуюць яшчэ дзеткі і старэйшыя, якія збіраюць грошы на патрэбы царквы, а ў Студзіводах і наваколлі дадатковва калядуе гурт „Жэмэрва". Некаторыя дзеткі носяць з сабой звёздачку, а некаторыя калядуюць з яслямі. Калі мы калядавалі, то гонарам было заспяваць як найлепш цэлую калядку, а развучвалі мы іх больш, каб часта не паўтараць. Цяпер бывае, што дзеткі заспяваюць дзве страфы калядкі, у якой мала багаслоўскага зместу, а пры гэтым яшчэ пераблытаюць многа слоў. Нават і дарослыя рэдка цяпер спяваюць калядкі з глыбейшым багаслоўскім зместам, такія як „Виде Бог", ці „Восклик-ните", якія на старажытнацаркоўнаславянскай мове стварылі манахі. Спяваюцца ў нас часта калядкі на беларускай, ці ўкраінскай мовах, у якіх многа свецкага зместу, — сказаў фалькларыст Дарафей Фіёнік са Студзіводаў, які разам з калектывам „Жэмэрва" збірае і запісвае старыя, рэдкія калядкі. — Аднак добра, што хаця бацькі дазваляюць калядаваць сваім дзеткам, каб падтрымлівалі традыцыю, бо бываюць выпадкі, што родзічы адмаўляюць дзіця ад калядавання, пераконваючы, што „дома ёсць грошы". Вельмі важна, каб захоўвалася традыцыя рэальнага калядавання, ад хаты да хаты, як было ў мінулым.

У Гайнаўцы можна яшчэ спаткаць невялічкіх каляднікаў. Жанчыны і мужчыны з гайнаўскіх прыходаў калядуюць па дамах і кватэрах у блоках, каб закалядаваныя сродкі прызначыць пазней на патрэбы парафіяў і гайнаўскага аддзялення Брацтва св. Кірылы і Мяфодзія. Два або і тры разы ў святочны перыяд у Гайнаўцы, а таксама ў Беластоку, Бельску-Падляшскім, а апошнім часам у многіх вясковых гмінных дамах культуры адбываюцца калядныя агляды, якія даюць вельмі многа радасці выступаючым. Асабліва цешацца наймалодшыя, дашкольнікі і вучні малодшых класаў, якіх уводзяць на сцэну і выводзяць апекуны і бацькі, памагаюць ім круціць звёздачкі. Калядаванне ва ўстановах культуры прыцягвае мясцовую публіку. Некаторыя дзеці, якія выступалі на сцэне, пасля рашаюцца калядаваць з сябрамі па дамах у сваіх сёлах і ў жыллёвых кварталах. Маладыя і старэйшыя каляднікі выходзяць на сцэну дзеля падтрымвання традыцыі і з патрэбы сэрца, каб славіць нараджэнне нашага Збавіцеля.

Аднак паяўляюцца таксама заўвагі спецыялістаў у адносінах да калядных аглядаў. Прадстаўнікі Ваяводскага асяродка анімацыі культуры ў Беластоку звярталі ўвагу выступаючым у Гайнаўцы ў час Ваяводскіх сустрэч калядоўшчыкам, што павінны апранацца так, як апраналіся каляднікі ў мінулым, у цёплую вопратку, і станавіцца побач звязды так, як станавіліся каляднікі перад акном або ў невялікай вясковай хаце ў час калядавання, каб паказаць абрад згодна з традыцыямі.

— Белыя блузачкі не падыходзяць да традыцыйнага калядавання, але цёплая вопратка таксама не падыходзіць да калядавання ў абагграваным памяшканні. Я запрапанаваў бы, каб агляд каляднікаў распачынаўся перад Гайнаўскім домам культуры, а, заспяваўшы некалькі калядак, калектывы разышліся б па Гайнаўцы ў розныя яе бакі. Дастаткова было б, каб паасобныя калектывы наведалі па дваццаць кватэр і вярнуліся ў дом культуры на супольнае гасцяванне і сумеснае спяванне калядак, як было ў мінулым, — сказаў старшыня аб'яднання „Музей малой айчыны ў Студзіводах" Дарафей Фіёнік. — Нашае аб'яднанне, напрыклад, з удзелам калектываў з розных краін Еўропы ў мінулым годзе было суарганізатарам такога калядавання ў Чыжах, дзе каляднікі, што хадзілі па вёсцы і тыя, якія слухалі спеваў, былі актыўнымі ўдзельнікамі калядавання. Закончылася яно супольнымі спевамі калядак і гасцінай у мясцовым асяродку культуры. У гэтым годзе не прадбачваем такога калядавання, але ў наступным годзе хочам ізноў арганізаваць калядаванне ў большым маштабе, згодна з традыцыямі.

Я таксама з'яўляюся прыхільнікам традыцыйнага калядавання, аднак у час Ражджаства Хрыстовага і ў паслясвяточны перыяд самае важнае не вяртанне да традыцый, але рэальнае перажыванне моманту нараджэння нашага Збавіцеля і перадаванне радасці ад гэтага здарэння іншым, між іншым, праз радасныя калядкі. Калі ёсць магчымасць, каб дзеткі, якія самі не пайшлі б калядаваць па хатах, выступілі на сцэне, няхай выступаюць і славяць Божае Нараджэнне, нават спяваючы сучасныя калядкі і апранаючыся як на канцэртнае выступленне. Спяванне калядак у цэрквах, у час багаслужбаў, гэта таксама традыцыя, а харысты, пад кірункам дырыжора, здаўна выконвалі іх і выконваюць на некалькі галасоў. Можна толькі задумацца як ацэньваць выступаючыя калектывы і гэта ад арганізатараў і конкурснай камісіі залежыць ці будуць раіць выступаючым, каб апраналіся традыцыйна і трымаліся такой манеры спявання, якая была ў мінулым, ці дазволяць апранацца і спяваць калядкі так, як спяваюць царкоўныя творы на фестывалях царкоўнай музыкі або ў музычным суправаджэнні, так як спяваюць свецкія песні на дзіцячых і моладзевых фестывалях. Думаю, што патрэбныя таксама традыцыйныя Ваяводскія сустрэчы калядоўшчыкаў, арганізаваныя, між іншым, у Гайнаўцы, бо за выступленнямі на сцэне назіраюць спецыялісты па фальклоры і падказваюць, што трэба падправіць, каб прэзентаваць сапраўдныя народныя традыцыі, а гэтага нельга было б дабіцца калядуючы толькі пад вокнамі гайнаўскіх дамоў. Аднак прапанова аб'яднання „Музей малой айчыны ў Студзіводах", рэалізаваная ў Чыжах, вельмі цікавая і добра было б, каб такая формула калядавання працягвалася. Калі б Гайнаўскі дом культуры схацеў, мог бы ладзіць і такое калядаванне і паказваць яго ў натуральных абставінах. Калі ў нашыя хаты і кватэры заходзіць вельмі мала каляднікаў, добрымі падарункамі з'яўляюцца касеты і кампакт-дыскі з калядкамі, бо яны таксама ўводзяць нас у радасны святочны настрой.

Гданьск салідарны з беларускай апазіцыяй

1

Тэкст заявы, пад якой збіраліся подпісы пры фантане Нептуна ў Гданьску супраць арыштаў у Беларусі:

„Мы, жыхары Трыгорада, выказваем салідарнасць з удзельнікамі мірнай дэманстрацыі 19 снежня 2010 г. у Мінску. Мы смуткуем па прычыне масавых арыштаў і збівання нявінных людзей, патрабуем неадкладнага вызвалення незаконна выкрадзеных асоб і правядзення свабодных выбараў без Лукашэнкі".

(Падпісаліся 162 чалавек, м.інш. прэзідэнт Сопата Яцэк Карноўскі, прэзідэнт Гданьска Павел Адамовіч, віцэ-прэзідэнт Гданьска Мацей Лісіцкі, праф. Генрык Цвікліньскі).

2

Заява Рады горада Гданьска ад 23 снежня 2010 г. у справе палітычнай сітуацыі ў Беларусі

Рада горада Гданьска заяўляе наступнае:

У апошніх днях былі мы сведкамі драматычных падзей, звязаных з прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі, прызначанымі на 19 снежня. Былі яны праведзены ў недэмакратычны спосаб, што пацвярджае ацэнка Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, якая не прызнала вынікаў і ўказала на шматлікія парушэнні. Голас незалежнай апазіцыі быў крывава здушаны. Шматлікія дэманстранты былі збіты і арыштаваны. Гданьск і яго жыхары ў мінулым няраз супраціўляліся недэмакратычнай уладзе. Таксама і сёння нельга нам заставацца глухімі на крыўду беларускага народа. Жадаем выказаць свой супраціў у адносінах да подласці аўтарытарнага рэжыму Аляксандра Лукашэнкі. Мы, дэпутаты горада Гданьска, салідарызуемся з удзельнікамі беларускай дэмакратычнай апазіцыі. Адначасна заклікаем кіраўнікоў дзяржаў Еўрапейскага Саюза прыняць рашучыя меры супраць прадстаўнікоў рэжыму ў Беларусі.

Старшыня Рады горада Гданьска
Багдан Алешак

Заява прынята аднадушна.

Ім далёка ў бібліятэку

Зараз доўгія зімнія вечары. Пенсіянеры з Новага Ляўкова (Нараўчанская гміна) у першы перыяд года ахвотна бяруць у рукі кніжкі. Але вось бібліятэка ў Старым Ляўкове, і да яе 2-3 кіламетры. Для старэйшых жыхароў гэта вялікі кавалак дарогі. Неўзабаве зімнія канікулы ў школьнікаў. Яны будуць мець шмат вольнага часу. Маглі б занесці цікавейшыя кніжкі ўсім ахвотным да чытання. Між іншым, раманы жанчынам ды ваенныя і прыгодніцкія тамы мужчынам. Прытым трэба толькі ўпісаць каму і колькі кніжак пазычылі. Пры нагодзе старшакласнікі лепш пазнаёміліся б з тымі аднасяльчанамі, да якіх мала хто заходзіць. Моладзь не павінна цурацца старэйшых і часта адзінокіх людзей. Асабліва зараз, зімой. Цяжка ім жывецца ў люты мароз і калі сцежкі-дарожкі занесеныя снегам.

(яц)

Эва Купрашэвіч і Барбара Пахольская

САКАЛЯНСКІЯ БЫЛІ І НЕБЫЛІЦЫ

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Першы напамін аб вёсцы Саколе Міхалоўскай гміны паходзіць з 1775 года. Налічвала яна тады 5 дымоў. Пачаткам вёскі праўдападобна была карчма ўласнікаў гарадоцкага маёнтка на шляху Бельск — Заблудаў — Гарадок — Гродна. У 1835 г. прылічвалася яна ў склад фальварка Валілы. У вёсцы жыло 6 хрысціянскіх сем'яў: дзве Янаў Храноўскіх, Тамаша Храноўскага, Кіпрыяна Ярэцкага, Якуба Казлоўскага і Якуба Змітрука, усяго 45 чалавек ды сям'я яўрэя-арандатара карчмы. У 1855-1860 гадах у Тапалянах шалела эпідэмія тыфу і халеры. Гэтая пошасць кранула таксама і жыхароў Саколя. Загінула амаль трэць насельніцтва вёскі. Пры дарозе ў Гарадок, перад ровам Сервітуты, разбілі могільнік, дзе хавалі пошасных — сакаляне завуць тое месца Магілкамі. У 1865 годзе лік жыхароў Саколя ўзрос да 87 чалавек, жылі тут 41 мужчына і 46 жанчын. У той час сяляне мелі 267 дзесяцін і 1050 сажняў зямлі, з таго пад сядзібамі 13 дзесяцін 540 сажняў, ворнай зямлі — 180 дзесяцін 360 сажняў, і лугоў 33 дзесяціны 150 сажняў.

5 студзеня 1886 года адкрыты быў чыгуначны шлях Беласток — Жэдня — Валілы — Ваўкавыск — Баранавічы. Пралягаў ён пры паўночным краю вёскі. Чыгунка выратавала быт Гарадка, а Беластоку дала лучнасць з Масквой праз Мінск і Смаленск. У Жэдні і Валілах былі вялікія чыгуначныя станцыі пабудаваныя па ўзору вакзала ў Беластоку, з абшырнымі заламі чакання, білетнымі касамі і рэстаранамі. У міжваенны перыяд гэтым шляхам ездзіў экспрэс Парыж — Масква з такой дакладнасцю, што па ходзе цягнікоў можна было звяраць гадзіннікі.

13 мая 1887 г. праводзіўся сход наконт адмены прыгоннага права ў вёсцы Саколе. Удзельнічала ў ім 68 сялян. Актамі надання зямлю агульнай плошчай 215 дзесяцін 120 сажняў (235,48 гектара) атрымалі на ўласнасць 35 сем'яў...

У 1921 г. у Саколі жыло 147 чалавек, між іх 70 мужчын і 77 жанчын.

17 лістапада 1937 года быў пасвячаны Народны дом імя Юзафа Пілсудскага (будаваўся 4 гады). Прыбылі на ўрачыстасць беластоцкі ваявода Генрык Асташэўскі, усе жыхары вёскі, ахвярадаўцы і фундатары разам з баронам Мантойфелем. Дом пасвяцілі пробашч каталіцкай парафіі ў Міхалове ксёндз Макары Янцэвіч і пробашч праваслаўнага прыхода ў Міхалове а. Васіль Гурнічук. У новазбудаваным доме змешчана была 4-класная публічная школа і вясковая святліца, на другім паверсе былі памяшканні для настаўнікаў. У 1937-1939 і 1944-1965 гадах вясковая святліца ў Народным доме служыла сакалянам выключна як зала сходаў і бальная на вяселлі, пускаліся тут фільмы перасоўнага кіно... Дзякуючы Згуртаванню вясковай моладзі, якое ўзнікла ў Саколі ў 1957 г. і рэактывавалася з 1965 г. пачалася развівацца тут спартыўная, асветніцкая, забаўляльная, культурная і тэатральная дзейнасць, якая працягвалася да 1987 года, калі быў ліквідаваны клуб „Рух". Узніклі тут тады два тэатры — традыцыйны і тэатр пры каве. Ставілі яны камедыі Аляксандра Фрэдры, Галіны Аўдэрскай і іншых драматургаў. Рэжысёрам тэатра пры каве была Барбара Масна-Пахольская, а традыцыйнага — Юзаф Куклінскі.

Пра дзейнасць і рэактывацыю Народнага дома, пра тое, як спынілася, з-за ліквідацыі чыгуначнага руху, лучнасць Саколя са светам, можна было б пісаць тоўстыя кнігі. Ды Барбара Пахольская і Эва Купрашэвіч, радная Міхалоўскай гміны, пачалі збіраць па крышынцы гэтыя гісторыі ў Бібліятэцы Таварыства сяброў Саколя. У 2010 г. выйшла кніжка „Паміж праўдай і легендай". Змяшчаюцца там сакалянскія легенды, аповеды, павер'і і анекдоты. Афармілі яе Уладзіслаў Петрук з Каралёвага Моста ў суседняй, Гарадоцкай гміне. Пішуць ва ўступе: „Жывем у свеце інтэрнэту, у глабальнай вёсцы. Безыменныя ў гарадах і адчужаныя ў вясковых асяроддзях. Знаёмых і сям'ю замяняюць нам сродкі масавай інфармацыі — тэлебачанне, інтэрнэт. Прападаюць міжчалавечыя сувязі, якія падтрымліваюць толькі кароткія эсэмэсавыя камунікаты. Практычна не размаўляем адны з аднымі, толькі абменьваемся інфармацыяй. Нецярпліва кіруемся да дасканаласці, бяжым наперагонкі на працы, у кампаніі, у школе. У гонцы за поспехам забываемся адкуль мы і дзе нашы карані. Мы хочам у гэтым выданні звярнуць увагу на безыменную творчасць, пераказваную ў вуснай форме з пакалення ў пакаленне ў вёсцы Саколе. На легенды, аповесці, павер'і і казкі, якія баялі нашы дзядулі і бацькі ў доўгія зімнія вечары, калі ў коміне завываў вецер... Прагнем ацаліць ад забыцця найбольш характэрныя расказы, якія жывуць ужо сваім жыццём і ад шматлікіх пакаленняў паўтараюцца ў штораз больш зменанай форме. На ацаленне для патомных заслугоўваюць таксама сакалянскія павер'і, якія выраслі з народнай мудрасці і зыркага назірання за прыродай. Верым, што дзякуючы іх спісанню выратуем кавалачак культурнай спадчыны Саколя, вёскі схаванай дзесьці на ўскраіне Кнышынскай пушчы... Кнігу прысвячаем нашым дзецям і ўнукам...". У кароценькіх, калярытных аповедах можам даведацца як узнікала Саколе, пра купца-п'яніцу Anno Domini 1775, але і Артура Гасбаха, што пражываў у Станку, пра каня без скуры, што прахаджваецца каля дома Карповічкі... Пра баязлівага кавалера, што баяўся ночу з забавы вяртацца... Пра гаспадыню-пявунню, што выспеўвала *Ой, п'яна я, п'яна, на парозе ўпала*... Пра славутага ардынарца палкоўніка „Ася", пра гастраномныя непаразумені ў сужонстве, Маскалёву трыбку, Стася-пастушка, цыганскія штучкі, пра бесталковага ўласніка ўпартай курыцы. І пра найстрашнага Ціпёра! І перадавіка працы — больш сучасны. І пазнаёмімся са спосабам на брахлівых сабак. І прачытаем цікавыя парады, скажам, такія: насенне дзеразы (відлака) лечыць хворыя ступакі, пролежні і раны, якія цяжка загойваюцца, а лучына ў шафе ганяе моль. І жартаўліва: калі ўпадзе табе скібка хлеба маслам уверх — ты шчасліўчык, а калі маслам уніз — вядома, няўдачнік!

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Успаміны

Сяргея СІЛЬВЕСТРУКА, народжанага ў 1923 годзе ў Зубаве

У сям'і нас двое было — яшчэ сястра, народжаная ў 1920 годзе. У бежанстве бацькі не былі, даехалі яны да Ваўкавыска і адтуль іх вярнулі.

У таты была вялікая гаспадарка, разам было 28 гектараў. Каб яе абрабіць, бацька наймаў парабкаў. Адзін з іх, са Спічкоў, восем гадоў у нас жыў. Я пры ім і вырас, усё хадзіў каля яго. А ён то санкі мне зробіць, то канькі — такія з палена і дроту на адну нагу. І трэба было з гэтым каньком хавацца, каб бацькі не ўбачылі і ў печ не парубалі, бо ад такіх канькоў валёнкі рваліся. У валёнках зімою хадзіў, а як цяплей было, то ў чаравіках або кедах. Я як мокра было, то басанож хадзіў, нагавіцы падвіваў.

У школу першыя два гады хадзіў у Кнаразы; усіх нас, хлопцаў і дзяўчат, хадзіла ў Кнаразы каля дваццаці чалавек. Зімою вазілі нас санямі. І Рэпнева ў Кнаразы хадзіла. Бо ў Зубаве царская школа была паднішчана, без падруб была. А як школу наладзілі, то мы ўжо тут вучыліся. У Кнаразах вучыла маладая польская вучыцелька, а рэлігіі вучыў Іван Барташэвіч з Зубава — ён у Кнаразы раз у тыдзень на чырвоным кані ездзіў, адукаваны ён быў.

У Зубаве вучыла Рашкоўская з Закапанага, тут жыла ейная ўся сям'я, трое іх было. А пад канец, да вайны, вучыў у Зубаве Бальтазар з Белавежы, афіцэр, паручнік. Перад выбухам вайны настаўнікі выехалі на канікулы і больш у Зубава не вярнуліся. Вучыўся я да чатырнаццатага года жыцця: адзін год хадзіў у першы клас, адзін у другі, два гады ў трэці і тры гады ў чацвёрты клас. Хадзіў я ў школу цэлы навучальны год — з верасня да чэрвеня. Але памагаў і ў гаспадарцы, ужо з трынаццаці-чатырнаццаці гадоў пасвіў кароў. У 1937 годзе закончыў я школьную навуку і бацька стаў паказваць мне, як араць. І цэп бацька мне зрабіў і ўжо трэба было да ўсялякай работы прывучвацца.

А пасля работы да дзяўчат хадзілі і так на вуліцы, пакуль дзяўчаты сядзелі, то і мы з імі, спявалі разам. У пост спявалі набожныя песні, а так то што хто ўмеў. Калі адзначалі святы — Вялікдзень, Руздво, Яна (прыхадское свята 7 ліпеня), Тэклі (7 кастрычніка), запусты, нядзелі — то і забавы ладзілі; па хатах гулялі або ў вылётных сенях. Ігнатко граў на скрыпцы, і Паўлюк. Гулялі толькі хлопцы з дзяўчатамі, парамі. Музыкантаў наймалі з Кнаразоў, Храбалоў, Сцідаводаў (Студзіводаў). І на забавы лепш апраналіся — кашулю, гальштук, а то дзяўчына не захацела б танцаваць.

Як хлопцы не бралі дзяўчыны, то яна „цыбулю прадавала", а як не хацела ісці танцаваць, то маглі прагнаць з забавы. Хлопцы выпівалі і музыкантаў частавалі. Тады гарэлка ў чвяртках была, але не ўпіваліся. Пілі толькі хлопцы, а дзяўчат прыпрашалі адно на Руздво.

У першы дзень Руздва калядавалі разам; людзі давалі каўбасу, яйкі. А на другі дзень хлопцы клікалі дзяўчат „на каўбасы" і забава была; гулялі толькі тыя кампаніі, што калядавалі. Пасля вайны бывала ў вёсцы і па тры кампаніі, па дзве забавы ладзілі. А на Трох каралёў дзяўчаты клікалі хлопцаў, піражкі пяклі (у нас піражкі былі, а ў Паўлах — галкі); піражкі з начынкай былі, толькі ў адзін муку насыпалі.

Калі насталі саветы, то ў Кнаразах зрабілі сельсавет; яго прадсядацелем стаў кнаразоўскі Сафрон Артэмюк, а сакратаром — Артэмій Стэпанюк. У нас сялянам гектараў не забралі, але калі стварылі тут калгас, то ўсіх коней забралі калгаснікам у адну стадолу і там конюх імі займаўся; у 1940 годзе конюхам стаў мой тата. Я ў калгасе не працаваў.

Я стаў на работу, у Плёскі, дзе арганізавалі торфазавод. Калісь у нас палілі торфам, а дровы былі толькі на распалку. Торф для торфазавода капалі на плёскаўскім і кнаразоўскім. Бюро торфазавода было там, дзе цяпер плёскаўскія могілкі. Там і сталовая для рабочых была; абеды былі за грошы, якія вылічвалі нам з зарплаты. У бюро было двух чыноўнікаў — начальнік і сакратар, а брыгадзір лічыў „цэглы" і запісваў. Кубы торфу клалі на тачкі і па дряўляных рэйках вазілі на сушку. Як торф высах, то стаўлялі яго ў прызмы. Пазней прыязджалі з Бельска трактары з прычэпамі і торф забіралі. Капалі толькі ў сезон.

З нашай вёскі ў Сібір саветы ўспелі вывезці толькі сям'ю Фрола Карпюка; самога Фрола трымалі яшчэ ў беластоцкай турме. У турму забралі таксама Яна Адамюка, бо камянёў на піліцкі аэрадром не вывез. Але нямнога яны сядзелі — калі выбухла вайна, то вярнуліся.

Нам гаварылі да вайны рыхтавацца. Старэйшыя хадзілі на вучэнні ў Кнаразы; мяне на вучэнні не бралі — быў я на год замалады.

Вайна выбухла ў нядзелю. Немцы зразу Бельск пабілі, а мы на роварах паехалі пабачыць, што там робіцца. Нас было трох ці чатырох, паехалі сцежачкай праз Суботку. Заехалі, пабачылі і назад. У Бельску почту пабілі, і на Аградовай снарад упаў; шмат народу збеглася пабачыць. Савецкага войска ў Бельску ўжо не было, паўцякалі; а да вайны было іх шмат, лётчыкі ў Бельску жылі. Вяртаючыся я яшчэ маму забраў, якая з царквы з Пасынак вярталася.

Нямецкіх салдат мы не бачылі. Пасля нямецкія жандары стаялі ў Храбалах і Кленіках. У Зубаве немцаў не было. Ранейшае калгаснае начальства асталося і ніхто іх не чапаў. У Зубава толькі аграном, што ў Пасынках за царквою жыў, заглядаў, брычкаю ездзіў; і як бражку пабачыў, то вывальваў. Нашага каня забраў ад бацькі, як на рынак завёў; за каня заплацілі. І як свінку ці збожжа аграном пабачыў, то таксама трэба было здаць. Пільнаваў ён гаспадароў, каб кантынгент здавалі. А як пабачыў, што хто ў кажусе малоціць, то дубінкаю яго частаваў. Бо ў кажусе малацьбіт заслаба біў цапом, а без кажуха мацней, каб нагрэцца, то і лепш выбіваў зерне.

Партызаны з Кожына і Плёскаў хадзілі; яны з немцамі не ваявалі, але вопратку або ежу забіралі, у Суботцы мост спалілі. Мне ватоўку забралі, пасак; адной жанчыне кажух забралі. Пагарэлі яны ў Ляхах, у клуні былі. Немцы пад'ехалі танкам, а яны сталі па танку страляць, то з таго танка далі па клуні; згарэла мо з васьмярых партызан.

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Капліца

Шмат турыстаў наведваючых Белавежу, асабліва замежных, часта спыняецца ля праваслаўнай капліцы, якая знаходзіцца па вуліцы Спартовай. Яна даволі маляўнічая, таму яе нярэдка фатаграфуюць або здымаюць на стужку, а мастакі ўвекавечваюць на палотнах. Трапляе яна таксама на паштоўкі.

Капліца паявілася ў краявідзе Белавежы напрыканцы XIX стагоддзя, дзякуючы белавежцу Якіму Байко. Быў ён чыгуначным машыністам, кіраваў першым цягнікам, які ў 1897 годзе прыехаў з царом Мікалаем II і яго сям'ёй у Белавежу. На хвалі энтузіязму, які ахапіў у той час белавежцаў у сувязі з узвядзеннем царскага палаца і давядзеннем да яе чыгункі, Якім Байко вырашыў падзякаваць Богу за ўсё гэтае шчасце, якое спасцігла белавежцаў.

Капліцу збудавалі белавежскія цесляры. Паставілі яе на краю тадышняга сяла, а зараз раёна Белавежы — Стачка. Цяпер гэтае месца выпадае на рагу вуліцы А. Вашкевіча і Завулка асочнікаў.

Першы здымак з капліцай зрабілі немцы ў 1916 годзе. Яны выпусцілі нават паштоўку з яе выявай. Потым здымак капліцы трапіў у кніжку В. Франца „Deutsche Arbeit im Urwald von Bialowies", выдазенай у 1917 годзе ў Берліне. На гэтых здымках бачым, што капліца была абгароджаная драўляным плотам. Побач яе раслі ёлачкі. Ля ўваходу ў капліцу бачым таксама невялікія ступені.

Паступовая разбудова сяла Стачок давяла з часам да таго, што капліца апынулася амаль у самым цэнтры сяла. Бачым гэта на здымку міжваеннага перыяду, які зберагаецца ў фондах

http://www.bialowieza.cerkiew.pl

Белавежская капліца на паштоўцы з 1916 года

Нацыянальнага лічбавага архіва ў Варшаве (дарэчы, згаданы здымак змешчаны ў маёй кніжцы „Z dawnej Białowieży"). Пасля заканчэння II сусветнай вайны белавежцы вырашылі перанесці капліцу ў другое месца, паблізу прыхадскога дома. Тут яна і стаіць дагэтуль. Побач капліцы стаяць таксама два праваслаўныя, драўляныя крыжы.

Пётр БАЙКО

Рэдакцыя „Нівы"
сардэчна дзякуе ўсім нашым чытачам, сябрам, установам, якія павіншавалі нас з наступаючымі Калядамі і Новым Годам

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Калядны і падарункі сэрца!

Першы раз афіцыйна будзем святкаваць Куццю. 6 студзеня — дзень вольны ад школы. Гэта цудоўная справа, бо якраз дзень да Ражджаства вельмі важны. Тады дапамагаем бацькам падрыхтавацца да свята. Дзеткі найбольш любяць упрыгожваць ёлку. Часам на галінках вешаюць сваёй вытворчасці каляровыя ланцужкі, цацкі з паперы і саломы. Люблю глядзець на ёлку з дзіцячымі цацкамі, бо тады яна здаецца „цяплейшай". Старэйшыя дзяўчаткі дапамагаюць рыхтаваць стравы. Дамашнія, якія ў гэты дзень чакаюць зорку — значыць, шчыра посцяць да Куццi — проста вар'яцеюць ад пахаў на кухні. Ну, але з-за гэтага чакання ежа пасля больш смакуе. Часам за сталом спяваем калядкі. Цікава, што пра старыя традыцыі напамінаюць бацькам іх дзеці! Яны просяць падрыхтаваць забытыя стравы або разам чакаць да зоркі. Адкуль дзеткі ведаюць пра колішнія абрады? Найчасцей са школы. На ўроках беларускай мовы шмат увагі адводзіцца народным традыцыям. У бельскай „тройцы" беларускую Куццю ладзяць паасобныя класы. Тады школьнікі самі рыхтуюць стравы, развучваюць калядкі, ставяць пастаноўкі, запрашаюць каляднікаў. Перадачы на гэтую тэму прапануне нам тэлебачанне. У апошні час меншы націск ставіцца на прыход Санта Клаўса з мяшком падарункаў. У некаторых школах адышлі ад абдароўвання дзяцей, аднак не забыліся пра гэты найважнейшы для іх абрад. Памянялася яго форма. Тыя грошыкі, якія раней ішлі на падарункі, зараз прызначаюцца на салодкі стол у дамах для сіротак, або на корм для бяздомных сабак і катоў, якіх злыя людзі прагналі з хаты. У апошнім жэсце бачым сэнс святкавання. Радасць ад падарункаў атрымліваюць усе, і асабліва тыя, якія дапамаглі іншым. Калісь лічылі, што найлепшы падарунак ад дзяцей — калядка. Яна, зразумела, мусіла быць новай і прыгожай, старанна развучанай і праспяванай. Святочны рэпертуар дзеці рыхтавалі ўжо ад свята Увядзення, 4 снежня, бо кожная група хацела пакінуць па сабе найлепшае ўражанне. Бо тых, што на хуткую руку падыходзілі да свята, высмейвалі і давалі толькі сімвалічную залатоўку.

ЗОРКА

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Галерэя ЗОРКІ

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

1. Імя і прозвішча: Юстына Марчук (V „ц" клас Комплексу школ з беларускай мовай навучання № 3 у Бельску-Падляшскім).

2. Твой любімы прадмет: беларуская мова, музыка.

3. У жыцці хачу стаць: спявачкай або ветэрынарам.

4. У сяброў цаню: калі мне дапамагаюць.

5. Не люблю: зайздрасці і маны.

6. Па-беларуску размаўляю: з мамай і бабуляй.

7. Кніжка,якая цябе захапіла: „Чарнільнае сэрца" Карнеліі Функе.

8. Падабаецца табе музыка: поп-музыка.

9. Твае ўлюбёныя стравы: салаткі, піца, бульба фры.

10. Твой любімы спосаб адпачынку: люблю паляжаць на канапе і чытаць кніжкі.

11. Калі дарасту хачу жыць: у Варшаве, бо гэта вялікі горад.

Міра ЛУКША

Жывінкі з глыбінкі (2)

Дзяцел з Дзенцялова

„Стук ды стук, стук ды стук!" —
дзяўбе дзяцел у тоўсты бук.
„Дзёўб-дзёўб-дзёўб,
дзёўб ды дзёўб!" —
таўчэ носам у цвёрды коўб.
А за дрэвам стаіць дом.
Жыве ў доме дзядзька Том.
Том спіць дома, а адтуль —
хрэп з прысвістам, як свіст куль!
Том храпе, дзяцел дзяўбе.
Няма ім справы да мяне.
Што пад букам мне стаяць?
Чаго ад Тома мне чакаць?
Маю справу я да Тома.
Ён жа спіць — напэўна — дома,
бо ж храпе напэўна ён,
а не йграе грамафон!
З дому адазваўся Том
(голас у яго як звон!):
„Перастань ты там дзяўбці!
Дай спакойна пахрапці!
Я не спаў мо сутак... тры...
Храпу-храпу-хры-хры-хры!.."
Адкуль літасць у дзятла?
Прадзяўбе ён бук датла!
У Дзенцялове ён панок!
У буку збудаваў дамок...
Буду цалкам неўпапад:
Запрашу на ліманад
іх абое — устане Том,
і не будзе дзюбаком
дзяцел біць ва ўласны дом.
Ліманад ці можа квас
вып'ем, пачастуем Вас!

Валавока і чалавек

(казка іракезаў)

Даўно-даўно гэта было. У адной вёсцы жыў малады паляўнічы. Яго папярэдзілі, каб не страляў да валавок. Раз, што гэта няўлоўна, два — птушку лічылі неразгаданай. Але аднойчы, калі хлапец пайшоў на паляванне і пабачыў валавоку, не вытрымаў ды пачаў страляць. Ён выпусціў шмат стрэл, стараўся як умеў, але стрэлы ўсё абміналі валавоку. Не шанцавала. Тады хлапец схаваўся за куст і чакаў, калі птушка прысядзе, каб было зручна яе забіць. І калі валавока прысела на галінку дрэва, за якім хаваўся паляўнічы, ён пацэліў валавоку ў голаў. Але не забіў. Птушка затрапятала крыламі і адляцела. Хлапец пабег яе следам. Ён бег, бег, аж дагнаў валавоку. Ну, не зусім валавоку. На месцы, дзе прызямлілася параненая птушка, ляжаў чалавек з акрываўленай галавой. Ён плакаў і стагнаў ад болю.

Паляўнічы спалохаўся. Адразу пабег у сваю вёску і расказаў пра ўсё грамадзе. Калі тыя зайшлі на месца здарэння, там ужо не было нікога — ні птушкі, ні чалавека. Ад той пары ў племені пачалі называць валавоку птушкай без скальпа!

І яшчэ больш здзіўляліся яе здольнасцямі. Вось, для ратунку перад смерцю, птушка параўтварылася ў чалавека і ўцалела.

ЗОРКА

Музыка з кайфам

Валачобнікі?!

Што за дзіва! Валачобнікі на Каляды?! А так, шаноўныя, у беларускай традыцыі, пра якую час ад часу варта ўспамінаць, і на Каляды хадзілі валачобнікі. Сёння нам асацыюцца яны толькі з Вялікаднем, з Пасхай. Шчыра кажучы, на Беласточчыне, здаецца, сапраўдных велікодных валачобнікаў так і не знойдзеш. Фарбаваныя яйкі ад бабуль ці хрышчоных бацькоў возьмем, але каб самому хадзіць ад хаты да хаты, спяваць, забаўляць і тады назбіраць яек ды каўбас — ахвотных няма.

Усё ж такі абрад калядавання яшчэ трымаецца. Тыя, якія бяруць каляровую звязду, а пасля з ёю падаюцца ў вясковы ці гарадскі маршрут з калядным рэпертуарам, гэта каляднікі-валачобнікі. Праўда, сёння цяжка дашукацца нейкага валачобнага, бо каляднікі перш за ўсё чакаюць грошай. Бывае, што гаспадар запросіць на пачастунак, найчасцей салодкі. Але гэта залежыць і ад гаспадара, і ад саміх каляднікаў: як, колькі, хто, што і чаму спявае! Яшчэ гадоў 20-30 таму каляднікі хадзілі з валачобнай ідэяй, бывала, атрымалі крыху грошай, але перш за ўсё чакалі цукеркаў. Але калі перанесціся ў даваенныя часы, то розніца бачыцца аграмадная. Тады, апрача звязды, хадзілі з казой, мядзведзем ці механошам. Механоша насіў мех, у які збіралі менавіта валачобнае: каўбасы, сала ды іншыя вырабы, якія гаспадары рыхтавалі з заколатага пад святы вепрука. Каза танцам расказвала гісторыю, памірала і ажывала, таму што калісьці прыносілі яе ў ахвяру пад Каляды. Ажывала, каб перадаць іншае значэнне Каляд як пераходнага часу. Мы ж гэта выдатна разумеем, бо адчуваем у гэты перыяд змены, калі Стары год мяняецца месцам з Новым. Каза была яшчэ вельмі важнай па іншай прычыне. Пасля каляднага ахвярапрынашэння з ейнай шкуры выраблялі дуду — адзін з найбольш сімвалічных беларускіх традыцыйных інструментаў. Мала хто сёння помніць, што каза танцавала пад гукі дуды. У нас у апошні час часцей можна было сустрэць акардэаніста, калі ўвогуле паяўляўся інструмент. Але дуды, якія выраблялі ў дасвяточны час, а пасля на працягу ўсяго года выкарыстоўвалі пры іншых абрадах, мелі вялікае значэнне для захавання традыцыі. Трэба гэтую традыцыю вярнуць і нам тут, на Беласточчыне!

i_basovka@o2.pl

Галерэя ЗОРКІ

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

1. **Імя і прозвішча:** Эвеліна Добаш (II клас гімназіі ў Орлі).
2. **Твой любімы прадмет:** фізкультура і асабліва баскетбол.
3. **У жыцці хачу стаць:** фатографам.
4. **У сяброў цаню:** калі яны вясёлыя і спагадлівыя, калі заражаюць добрым гумарам.
5. **Не люблю:** калі не кажуць праўды і не стрымваюць слова.
6. **Па-беларуску размаўляю:** з бацькамі і бабуляй.
7. **Кніжка,якая цябе захапіла:** «Змярканне» (фантастыка пра крывасмокаў).
8. **Падабаецца табе музыка:** папулярная.
9. **Твае ўлюбёныя стравы:** печаная курацiна, кебаб, салаткі.
10. **Твой любімы спосаб адпачынку?** Так, я люблю сустракацца з сябрамі.
11. **Калі дарасту,хачу жыць:** не ведаю.

Польска-беларуская крыжаванка № 2

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 50:

Крук, мэта, клас, пробліскі, плыт, яслі, лама, азон, мац, кок, бо, ні, арол, Адам, скарбонка. Кут, план, плаціна, Рым, мотаклуб, клямка, ліс, рак, масла, ода, эскіз, ла, Об, мы, сноп.

Узнагароды, каляровыя алоўкі, выйгралі **Паўліна Паплаўская, Павел Кучынскі, Кшыштаф Мінкевіч, Эльвіра Андрусевіч, Міраслава Дмітрук, Юстына Марчук** з Бельска-Падляшскага, **Рафал Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



Віктар ШВЕД

Вяртанне ў небыццё

На маладога лесу фоне,
Ў асенняй палявой пустэчы,
Дрэва знаходзіцца ў агоніі,
Прыняўшы выгляд чалавечы.

На ствале-целе, што ўмірае,
І выглядае сіратліва,
Нібыта галава людская
З валос развеянаю грывай.

Здаецца, рукі – дзве галіны
Ў адным цягнуцца кірунку,
Як быццам бы яны няспынна
Просяць кагосьці паратунку.

Кругаварот

Зямля забрала нам бацькоў,
Бацькамі сталіся мы самі.
І састарэліся ізноў,
І хутка пойдзем за бацькамі.

Такі жыцця кругаварот
На нашым незвычайным свеце.
Нясе нам змены кожны год,
Становяцца бацькамі дзеці.

Імчыць людская карусель,
Якая ў пастаянным віры.
Яе аднолькава мадэль,
Змяняюцца дык пасажыры.

Маланкава імкнуць гады,
Нясуць світанні і змярканні.
Нас накіроўваюць туды,
Адкуль ужо няма вяртання.

Праваслаўныя могілкі

У апошнюю праводжу я дарогу
Сваякоў, сяброў сваіх, знаёмых.
Як жа тут памерлых многа, многа...
Што, каб маглі, сказалі б: „мы ўжо дома".

Сярод магіл блукаю адзінока,
Тут штораз больш усё мяне цікавіць.
Якая ж спальня сумная навокал!
І мой спачын тут будзе неўзабаве.

Бачу, знікаюць з намагільных плітаў
З нябожчыкамі звязаныя словы,
З кірылічным, нам блізкім алфавітам,
І з нашай роднай беларускай мовай.

Калісь тут прыйдуць нашыя нашчадкі
І на магілах расшыфруюць знакі.
Народзіцца тады такая згадка:
Ляжаць тут праваслаўныя палякі.

Ражджаство Хрыстова

Усявышні Нараджэнне
Здзейсніў Сына ў Віфляеме,
З думкаю аб выбаўленні
Ад грахоў людскога племя.

Молім мы Цябе няспынна,
Усяўладны наш Ісусе,
У сапраўдным памажы нам
Адраджэнні Беларусі.

Каб народ наш жыў заўсёды,
Не расплыўся, не загінуў,
Памажы майму народу
Мову захаваць, Айчыну.

Новае выданне

АДПЛЫВАЦЬ З МОРА ЯШЧЭ РАНА

Сяргей ЧЫГРЫН

Роднай вёсцы Мора, што на Беласточчыне, паэт Віктар Швед прысвяціў шмат шчырых паэтычных радкоў. Так міла і хораша ён апеў Мора, як Алег Лойка свой родны Слонім, як Рыгор Барадулін сваю Ушаччыну, як Янка Купала апеў Беларусь. У новым паэтычным зборніку „Адплываем з Мора", які нядаўна, дзякуючы Праграмнай радзе тыднёвіка „Ніва", пабачыў свет у Беластоку, аўтар зноў вяртаецца да Мора, да сваіх землякоў, сваякоў і сяброў. Прачула, адклікаючыся самымі чыстымі глыбінямі душы, гучаць вершы Віктара Шведа, якія так ці інакш звязаныя з родным бацькоўскім гняздом, з маленькай радзімай, з аднавяскоўцамі. Але на гэты раз у радках і між радкамі паэта адчуваецца ўзрушанасць, трывога, нейкі жыццёвы адчай. Ды і назва зборніка таксама самотная — „Адплываем з Мора". Хаця мы добра ведаем і разумеем, што ўсё проста ў гэтым свеце: адны нараджаюцца — іншыя паміраюць, такое яно жыццё, такі закон прыроды:

Маланкава імкнуць гады,
Нясуць світанні і змярканні.
Нас накіроўваюць туды,
Адкуль ужо няма вяртання.

Па вялікім рахунку, у цэлым зборнік багаты па настраёвасці, шчыры і непасрэдны па гучанню. Магчыма, менавіта творчасць гэтага паэта сёння можа служыць пераканальным пацвярджэннем, калі гэта каму спатрэбіцца, як шмат значыць у агульным фарміраванні паэта звычайная шчырасць пачуцця. Здаецца, шмат якія сур'ёзныя творчыя ўдачы і дасягненні паэта маюць сваёй падасновай здзіўляючую здольнасць адкрывацца на праявы жыцця перш за ўсё рэакцыяй сардэчнай шчырасці. Шчыры паэт у жыцці, шчыры ў сваёй паэтычнай творчасці. І адкрыцці яго вельмі простыя, зразумелыя, гістарычна-апісальныя, немудрагелістыя. Ён не можа мудрагеліць, бо ўсё жыццё паэта было няпростым і нялёгкім, пра што распавядаецца ў вершах.

Зборнік Віктара Шведа „Адплываем з Мора" — гэта найперш аўтабіяграфічная паэтычная кніга. З яе любы чытач даведаецца, што бацька паэта быў царскім салдатам, які некалі ўцёк з палону і, дзякуючы мазалям, ён застаўся жыць. Што потым бацька збіраўся эміграваць у Аргенціну, каб зарабіць грошай, але ён быў няздольны да цяжкой працы, бо кульгаў. Чытаючы вершы, лёгка можна даведацца, што маці паэта вельмі шмат працавала, што мама, седзячы, драмала, што яна мала спала, а цяпер „працай змучаная мама на пагосце, пад крыжамі спіць спакойна сном трывалым..." і г.д. А далей мы даведаемся пра родную сястру Ніну і брата Пецю, якіх ужо няма на гэтым свеце.

Зборнік „Адплываем з Мора" — гэта гісторыя беларускага Падляшша і яго людзей. Паэта хвалюе, што беларусы Беласточчыны ўжо сталі панове, што толькі дзетак „горстачка малая ў Беластоку вывучае сваю мову" і што, дзякуючы тыднёвіку „Ніва", паэт заўсёды быў шчаслівы, бо менавіта ў „Ніве" — „майго ўсяго жыцця адбітак".

Зборнік „Адплываем з Мора" — гэта кніга прысвячэнняў пры свячэнні. Як пісаў Сяргей Панізьнік, „каб жылі мы



ў пасвячэнні, што і нашыя імёны узгадаюць пры свячэнні". Віктар Швед шчыра прыгадвае ў вершах слаўныя імёны беларусаў Польшчы, з якімі быў знаёмы, сябраваў, тварыў беларушчыну. Гэта і прафесар Васіль Белаказовіч, журналістка Ада Чачуга, гэта Кастусь Майсеня, Янка Крупа, Зінаіда Навіцкая і іншыя. Шмат шчырых радкоў паэт з Мора прысвяціў сваім сябрам па пяру, сябрам па жыцці — Дзмітрыю Шатыловічу, Алесю Барскаму, Міраславе Лукшы, Аліне Ваўранюк, Басі Пякарскай, Міхасю Хмялеўскаму, Уладзіміру Юзвюку, Уладзіміру Наумюку, Пятру Гагану ды іншым.

Зборнік „Адплываем з Мора" — гэта кніга лёсаў. Лёсаў беларускай сям'і, роднай вёскі, краіны. Паэт неабыякавы да гэтых лёсаў. Ён сам шмат перажыў, бачыў, ведае. Віктара Шведа, як і любога беларуса, найбольш хвалюе лёс краіны і роднай мовы. Паэт пытаецца ў сябе і ў чытачоў:

Чаму Беларусь рускамоўная,
Калі маем уласную мову?

Сапраўды: чаму?.. І ў той жа час аўтар верыць, што „герб наш абаронім і сцяг наш бел-чырвона-белы".

Калі я пішу пра шчырасць новага зборніка Віктара Шведа, гэта не значыць, што паэзія шчырага выпявання, простых вобразаў заўсёды просценькая па змесце. Ёсць прастата, непасрэднасць і звычайнасць, якія зусім не супрацьпаказаны адлюстраванню складаных і глыбокіх зрухаў чалавечага быцця. У вершах Віктара Шведа за прастатой не адзін раз адкрываецца сапраўдная інтэлектуальнасць у адчуванні і разуменні рэчаіснасці. Яна ўмее пранікаць праз простае аблічча рэчаў у глыбокую сутнасць спраў чалавека, як, напрыклад, у вершах „Наш Новы Запавет", „Адплываем з Мора", „Этапы прамінання", „Мала мама спала" і іншыя. Зусім простыя вобразы ў гэтых і іншых вершах нясуць часта багацце ўзнёслага зместу, філасофію глыбокага напаўнення. А ўнутраная прывязанасць паэта да вобразных утварэнняў, блізкіх да простага ладу беларускага жыцця, моцная і відавочная. Але нельга сказаць, што ва ўсёй паэзіі Віктара Шведа глыбокі філасофскі змест выяўляецца толькі ў нескладаных, простых формах мастацкага мыслення. Не, у новым зборніку паэта нямала складаных мастацка-стылёвых вырашэнняў, у якіх выявілася імкненне паэта данесці да чытача плён напружанага філасофскага роздуму над светам. Нярэдка сустракаюцца спробы абагульніць у паэтычных вобразах сам ход гістарычнага працэсу, няпростую злучанасць з гэтым працэсам сучасных намаганняў беларусаў. У багатым спектры светаадчування паэта, бадай, найбольш ярка і акрэслена вылучаюцца тры скразныя паэтычныя матывы — сям'я, любоў да працы, яе ўслаўленне і любоў да Радзімы, да бацькоўскай зямлі:

Не магу я заснуць цвёрдым сном,
Не магу я самкнуць свае вейкі.
На сасне за пакоя акном
Так прыгожа пяе салавейка...

Адзін з раздзелаў кнігі прысвечаны гумару, ён так і называецца — „Аб жыцці шчыра ў святле гумару і сатыры". Я прачытаў з усмешкай гэты раздзел і прыйшоў да высновы, што Віктар Швед — добры гумарыст. Вось дыялог двух літаратараў: Сакрата Яновіча і Віктара Шведа. Яновіч часта пытае ў Шведа: чаму ён так доўга жыве? На што аўтар адказаў вельмі арыгінальна:

Як зразумець акурат
Думкі Сакрата, паверце,
Каб жыць мог Яновіч Сакрат
Ці ж Віктар павінен памерці?..

Прачытаўшы мой водгук пра кнігу Віктара Шведа, шаноўны чытач запытаецца: няўжо ў новай паэтычнай кнізе Віктара Шведа ўсё так добра і гладка? Вядома ж, не. Як і ў кожнага аўтара, так і ў новай кніжцы беластоцкага паэта, ёсць сякія-такія і недахопы, але іх няшмат. Ну, напрыклад, у вершы „Аўтамабільнае крушэнне" чытаю:

Пагас электрычны стоўп,
Навокал людзей натоўп.

Правільна і па-беларуску будзе „патух электрычны слуп", а слова „стоўп" у беларускай мове няма, у рускай мове ёсць слова „столб". А калі замяніць слова „стоўп" на слова „слуп", то ўжо губляецца рыфма са словам „натоўп".

Ці першы радок верша „Мы шагаем па родным краю...". Чаму „шагаем"? Ёсць добрае беларускае слоўка „крочым", а „шагаць" — гэта рускае слова.

Я прывёў тут некалькі моўных хібаў зборніка „Адплываем з Мора", але, яшчэ раз падкрэслю, іх няшмат. Таму ад душы прызнаюся, і гэта не будзе перабольшаннем, што ўся кніга вершаў Віктара Шведа „Адплываем з Мора" пакідае адчуванне вялікай, напружанай і пастаяннай творчай працы. Працавітасць паэта найбольш бачыцца ў ягонай лёгкасці і дакладнасці радка, у нечаканасці і змястоўнасці вобраза. Шмат якія вершы нейкім дзіўным, ледзь-ледзь улоўным эмацыянальным акцэнтам даюць адчуць, што яны ствараліся аўтарам з любоўю, што сама творчая паэтычная праца прыносіць паэту велізарную радасць. Так што, шаноўны спадар Віктар, Вам адплываць з Мора яшчэ рана. Жывіце, пішыце і радуйце нас, чытачоў, сваім паэтычным словам.

Пераклад з польскай мовы

ПАЭТ ПАЭТУ Ў ЗАЛАТЫЯ ЛЕТЫ

Францішак КАБРЫНЬЧУК

Віктару Шведу ў 85 гадавіну нараджэння

Вітанні Табе добры Віктар,
чуллівы на красу, спакой.
Зараз з Парнаса, як рэлікты,
музы ўкленчаць прад Табой.

Сябар з часопісаў дзіцячых,
„Пламычка", „Свершчыка" ў сталіцы,
Сёння на Юбілей удачны
Песня з лугоў, лясоў бруіцца.

* * *

Бурлівае неба над Морам[1]
напоўнена шчэбетам птушак,
Ты, Віктар, дзіцячыя хоры
чуеш і безліч узрушань
за маці Тваёю і хатай.
Гэта Тваё, паэт, дарагое
аддадзена думкам багатым,
Тваёй душы царства зямное.

Няма ў ім тронаў прыбраных,
сярэбраных жэстаў, палатаў.
А мэбля, цяпер ужываная,
быццам з Тваёй старой хаты.

Спрачаецца ў жорнах каменне,
быццам хрыпенне старушак.
Навокал чутно сушэнне
на зіму грыбочкаў і грушаў.

Капуста хоча закваскі
і цеста ў дзяжы аддыхае.
Печ, цмок вогненны з казкі
на хлеба бохны чакае.

Маці з іконай гаворыць,
у хаце хвіліна святая.
За акном цыбаты жораў
са студні ваду выпівае.

У наваколлі шмат смецця —
саха, барана, што знікае.
Хоць нічога не значаць на свеце,
Ты як кроўнае гэта кахаеш.

Басанож, сваіх ботаў шкадуеш,
гоніш раніцай быдла на пашу.
Помні, Віктар, такая статуя
Калісь стане у Моры вашым!

Можа нейкі юны Хэлмоньскі
кіне вогнішча зноў на карціну
і Цябе на хрыбце ўвечніць конскім,
малым едзеш на пашу хлапчынай.

А Твой татка купіў Табе ровар,
каб мог ездзіць у горад да школы.
Не меў грошай, прадаў ён карову
з гэтай мэтай. Не быў яшчэ голы.
І тады Твой дабрэйшы тата
меў такую надзею, як святасць,
што здабудзеш і грошы, і славу,
што адкрыеш калісьці Варшаву.
А Ты потым вяртаўся, вядома,
каб бацькоўскім нацешыцца домам
і цяплом матулі і печы.
Шукаючы ад гразі ратунку
бацька Твой браў ровар на плечы
і даносіў яго да чыгункі.

Асталася з ровара рама.
Як ромб у форме, як драма.
Вісіць у клуні пастаянна
Тваё з маладосці каханне.

Сталася так, не іначай.
Бяручы на плячо раму,
ходзіш з ёю і плачаш,
каб прыгалубіць памяць.

У сне сядзіш на каленях мамы.
У пэўнай Кнізе напісана прама:

Сапраўды, сапраўды ўсім раду дам:
калі дзіцём не былі ў жыцці
тады бяда, шматлікая бяда,
бо ў Каралеўства не зможаце ўвайсці.

* * *

Калені матчыны — мяккія калені —
дастатку поўная паляна ў лесу ценю.
Гэта трон узнесены над троны,
ад зямлі ўзроўню да нябеснай зоны.
З такой вышыні ў абліччы маці
можна вобраз Бога ўбачыць,
як у яе змяняецца Ён, Векуісты,
у магутнасці цуду, у Эўхарыстыі.

* * *

Вяртаемся, Віктар, з Мора з надзеяй,
што развіталіся з настальгіяй нашай.
Сёння ўжо, на Тваім Юбілеі,
час абцяжарыць далонь чашай,
час, каб асушыць яе да дна,
бо поўная лопнуць нам можа,
за здароўе Той, што годная,
каб падзякаваць Ёй прыгожа —
Тваёй Жонцы, каханай Валі,
трэба каб шчасця Ёй пажадалі,
каб многа тостаў сёння паднеслі,
ад сэрца ўручылі што Ёй прынеслі.

Бо ведай, Віктар Дабратлівы,
хоць Ты пяром арэш сваю ніву,
яна сейбіт, што сее зярняты
каб Тваёй паэзіі быў плён багаты.

Кожная паэзія на вышэйшыя троны
ніколі не ўвойдзе як грэчаскі Сізіф,
калі не мае сэрца Музы натхнёнай,
тады ёсць толькі дно, што завуць: крызіс.

* * *

Паэзія гэта дзіўная тканіна,
што не сатчэш на кроснах такое.
Паэзія гэта важная галіна,
што як візія, прабуджэнне вясною.

Паэзія гэта нашае Падляшша,
зямля з сяўбой пакаленняў нашых,
думак і чынаў і плёнаў многа,
святых вартасцей багатым і убогім.

* * *

На гарызонце лясоў Тваіх готыка[2],
зялёных вяршынь сонцам сагрэтых,
гэта пад'ём, гэта неба дотык
нашай прыроды, зімы і лета.

Гэты прыгожы від пад Заблудовам
я бачыў, калі быў блізка лясоў вашых,
калі сонца за готыку лясоў сасновых
хавалася, сыходзячы з неба тэрасы.

Дубы і ліпы, клёны і грушы,
што стаяць падрад навідавоку,
прыгажосцю асабліва ўзрушаць
калі паказваюць сваё барока.

* * *

Кажаш, Віктар, што пахне трава,
калі ўмірае, стаючыся сенам.
Мне шчасце дзіўнае Ты дараваў,
ёсць праўда ў гэтым, што ад еўглены,
паводле кнігі Эклезіяста[3],
розныя звяркі, расліна малая
маюць свае душы, такія кісяі
форму імглы прыбіраюць часта.
Пах раслін розных душой прыроды,
пасля яе смерці знікае заўсёды
і святы настой з вадою стварае,
калі Белавежская пушча аддыхае.

* * *

Чытаю ў Тваім, Віктар, творы,
як аглядаюць дзеці мора.
Не тваю вёску, толькі ў Гдыні
дзеці з патухлымі вачыма.
Нехта зрабіў ім той падарак —
сустрэчу з вадзяным абшарам.
Тады слых з нюхам — два пачуцці
зроку далі сваю падпору.
І раптам дзецям невідушчым
бліснулі чайкі па-над морам.
Мора развітвалася басам,
жадала бедным дзецям дужэць.
Вярталіся да сваіх Лясак[4].
З ручкамі ў ручках пайшлі гужам.

* * *

Я таксама да Маці такой самай дарогай
як Ты ездзіў з пустою валізкай[5],
каб вяртацца з поўнай, зусім не ўбогай
у дабрыню матулі, таму так мне блізкай.

Студэнцкая мая валізка старая
з кардону, дзесь там у дзеях чарговых
згінула. Думаў, яе зноў адшукаю,
аднак прапала яна канчаткова.

Валя, Твая жонка, дзесь у Беластоку
так нядаўна, шукаючы навокал
знайшла маю, асыпаную пылам
валізку, што са мной хадзіла,
як студэнтам да мае надзеі,
да роднай матулі. У маім Юбілеі
прывязла яе сюды, у Варшаву.
Шаноўная Валя, жонка ягоная,
Паэта Муза, спадчынніца славы
і яшчэ больш — залатая карона.

* * *

Пад друзамі Іерусаліма
плакаў біблейскі Іерамія,
а Ты з хворымі вачыма
плачаш аб тым, што дарагія
Тваё Падляшша, Тваё Мора
уміраюць з валошкамі ў жыце,
што травой зарастае прастора
і платы пачынаюць валіцца,
што былі для хат адвечна,
як перыкард сардэчны.
Тут старэчы ўжо няспынна
лечаць на сонцы хваравітасць,
для якіх яшчэ айчына
ставіць свой супраціў нябыту.

* * *

У пятніцу тут упадуць на хвілю
дзеці з Варшавы грамадою,
з музыкай тэхна, нават з грылем
і рэдка калі з ... тугою.

* * *

Лірніку слёзны, Віктар,
на пагранічча двухгалосы,
прыгалуб свой жаль і канфлікты,
бяры сваю лютню і босы
гані на пашу жывёлу.
З Тваёй лютняй — будзеш спяваць,
што чало Тваё аздобіць,
калі тых, што жыцця не праспяць
Бог у анёлаў пераробіць.

Падляшская прырода з'яўляецца Тваім алтаром, перад якім молішся і адпачываеш. Чысцінёй найчысцейшай, чароўнасцю найпрыгажэйшай. Яе зялёная кроў — хларафіл з вадой і вуглекіслым газам у веліччы сонца паўтараюць ад мільёнаў гадоў аднаўленне жыцця, вакол Твайго горада. Расліннасць у Тваёй „дарослай" творчасці з'яўляецца як пунктуацыя, якая ўводзіць граніцу паміж ажыўленай і неажыўленай натурай. Уважліва слухаючы і гледзячы, чую ціхі гоман „белавежскіх лясоў", як „залатой лістотай плачуць дрэвы", бачу „бярозу са свежай ранай", „разгалінаваныя вербы, што моляцца пры дарозе", бачу „на гарызонце лесу готыку", „валошкі, як сімвал Беларусі", „кветкі незабудкі, што ўміраюць ціхутка", „бела-чырвоныя гваздзікі" пад помнікам Адаму Міцкевічу ў Бургасе, бачу „як зоры на палянах рассыпаны суніцы", „лаўлю пах кадзільны з сасновай жывіцы" і чую „пах травы, што ператвараецца ў сена", а таксама даведваюся аб „ружы кароткачасовасці".

Твая творчасць, Віктар, з'яўляецца фатаграфіяй гэтага свету, калі Ты і я, бегалі басанож па айчыннай Падляшскай зямлі, аб'яднаныя з людзьмі і прыродай, што праўда — найчысцейшай. Ці тады прадбачвалі мы што будзем пісаць вершы для дзяцей? Хіба не! Але можа нашыя Маткі, якія паводле нашых меркаванняў былі горшымі ад Бога — вымалілі нам гэты дар — Твая, перад іканастасам у прыхадской царкве, а мая перад Найсвяцейшай у цэранаўскім касцёле.

У сваіх вершах падушачкамі пальцаў датыкаеш тае рэчаіснасці, нашага дзяцінства, іграючага паміж двума агністымі слупамі сусветных войнаў. Этнографы будуць у Тваёй творчасці, як у лексіконе, шукаць мінуўшчыны. Будуць мець лягчэйшую задачу ад археолагаў склейваючых шкарлупінкі гісторыі ў сумніўную цэласць. Гэтыя першымі будуць мець гатовыя сцэнарыі жыцця, не толькі візуальныя, але таксама папоўненыя галасамі птушак — мовай прыроды, пахам соснаў і ядлоўцаў, магчымасцю дакрануцца да пульсу таго закутка свету, аб якім памятаў Стварца, калі яго ажыццяўляў.

У маім касцёле мудры прапаведнік сказаў, што не так медыцына, як Бог прадаўжае чалавеку жыццё таму, каб мог ён здзейсніць планы і мары так шчодрыя ў гэты сучасны момант, памножыць таленты, каб мог ён у найвышэйшай ступені зрабіць Зямлю сабе падданую.

Тваё 85-годдзе ў такім толькі бачанні з'яўляецца сталым векам, забавязваючым да дзейнасці. Глянь, у зале Твае блізкія — землякі, сябры, госці, паклоннікі Твайго таленту. Будуць Табе жадаць усяго, што добрае, найлепшае. У гэтай урачыстай хвіліне я да іх, a priori далучаюся выказаным словам разам з маёй Валяй, перапрашаю, Ягодай.

[1] Вёска Мора — месца нараджэння Віктара Шведа.
[2] Загаловак верша Віктара Шведа.
[3] Адна з кніг Старога запавету.
[4] Асяродак школьна-выхаваўчы невідушчых дзяцей.
[5] Студэнцкая валізка — загаловак верша Францішка Кабрыньчука

Гульня ў выбары

Упершыню з 1994 г. на прэзідэнцкіх выбарах паявілася нармальная канкурэнцыя, якая тэаратычна магла давесці да другога тура. 10 кандыдатаў, хочаш не хочаш, дае магчымасць выбару кожнаму грамадзяніну. Неяк пасля дзіўнаватай апазіцыйнай акцыі вылучэння адзінага кандыдата на папярэдніх выбарах, раптам адзінага вылучыць не ўдалося. Назіраючы ўсіх дасюлешніх „адзіных" відаць, што „раскручвалі" іх на адны выбары. Не выйгралі — і даволі гуляць у выбары ды гойсаць па еўрапейскіх салонах. У дзень выбараў 19 снежня падумалася мне: „А дзе ж яны зараз? Чаму ж не падтрымліваюць яны каго-небудзь з незалежных кандыдатаў?". Нават той жа Аляксандр Мілінкевіч, рыхтаваны на еўрапейскага, беларускага палітыка, паявіўся толькі пасля выбараў і пачаў заклікаць падтрымаць затрыманых удзельнікаў нядзельнай дэманстрацыі.

Выбары ў Беларусі сталі тыповым палітычным рытуалам, які няшмат супольнага мае з сапраўдным выбіраннем. Хаця галасаванне пачынаецца тыдзень да вызначанай даты, не пішацца праўды, што адбываюцца яны з 12 па 19 снежня, толькі як тэрмін выбараў падаецца апошнюю дату. Цікава таксама, што да нядзелі 19 снежня прагаласавала больш за 20% выбарцаў. Нават Еўропай успрымаецца гэта як нармальная з'ява, а можа нават як беларуская выбарчая своеасаблівасць...

У беларускай палітычнай рэчаіснасці заўсёды так было, што трэба было мець адвагу супраціўляцца. Народ дзіўны — ад Смаленшчыны па Беласточчыну вылучаюць яго пэўныя характэрныя асаблівасці. Аўтарытэтаў у ім зашмат не можа быць — адзін лідар, адзін гісторык, адзін інтэлектуал, адзін паэт, адзін пісьменнік... Ну, часам можа двух, але не болей... Паводле некаторых сацыялагічных тэорый з трох пачынаецца грамадская група, а то ўжо становіцца небяспечным. І так беларускаму народу наканаваны аўтарытарызм — у грамадскім жыцці, у навуцы, культуры... У палітыцы быццам бы таксама можа быць, але як паказвае гісторыя аўтарытарызмаў, гэта заўсёды дрэнна канчаецца... Англійскі палітолаг Бернард Крык у 1960-я гады пісаў, што палітыка павінна абапірацца на разнароднасць і кампрамісы. А калі народ да гэтага не прывыклы? Калі не навучаны супраціўляцца волі бацькі, толькі яму ва ўсім падпарадкоўваецца, калі навучаны не думаць, жыць у страху ад найменшага парушэння накінутага парадку, хоць ён і не заўсёды падабаецца?.. Беларусы не маюць дэмакратычнай традыцыі ды не навучаны змагацца за дэмакратыю.

А тут раптам быццам бы маюць адбыцца дэмакратычныя выбары. Усе навокал павучаюць у чым заключаюцца дэмакратыя ды свабодныя выбары: Радаслаў Сікорскі і Гіда Вестэрвелле — Аляксандра Лукашэнку (абяцаючы мільярды еўра за „навуку" ў галіне дэмакратыі і свабоды), журналісты — грамадства.

Беларуская гульня ў прэзідэнцкія выбары мае своеасаблівае вымярэнне — загадзя можна прадбачыць іх вынік. Як гаворыць шмат хто, можна іх толькі байкатаваць, бо толькі байкот мае сэнс. Ужо гадамі выбары ў Беларусі не прызнаюцца міжнароднай супольнасцю, але дзяржава існуе і мае адносіны са светам. Рэальная ўлада Аляксандра Лукашэнкі не абмяжоўваецца ніякімі сродкамі і не падвяргаецца грамадскаму кантролю. Чарговыя выбары ў Беларусі рэальна легітымізуюць яго ўладу на новы тэрмін. Адміністрацыйныя структуры дзейнічаюць дасканала ў напрамку легітымнасці ўлады. Падпарадкаванне сабе практычна ўсяго грамадска-палітычнага ладу жыцця ў краіне стварыла бязвыхадную сітуацыю. Каб гэта ўсё памяняць, патрэба шмат адвагі і супраціву ў грамадстве ды моцнай апазіцыі, якая зможа павесці народ у лепшую будучыню. Аказваецца, у Беларусі на чарговых выбарах дапускаецца іх фальсіфікацыя, з якой немагчыма змагацца назіральнікам, бо галасоў аддадзеных на кандыдатаў камісія не лічыць. Так прынамсі сведчылі назіральнікі ў інтэрнэце.

Рэгістрацыя 10 кандыдатаў на прэзідэнта ў Беларусі паказала на амбіцыі шмат каго займаць гэтую пасаду ў дзяржаве. Можна сказаць — нічога дзіўнага. У Польшчы такая сітуацыя з'яўляецца ўжо нормай. У Беларусі гаворыцца, што апазіцыя раз'яднаная. А чаму мае быць з'яднаная вакол аднаго чалавека? Дзе ў свеце абавязваюць такія стандарты? Звычайна яднанне зводзіцца да другога тура, калі выступае насупраць сябе двух кандыдатаў, якія інтэгруюць палітычную сцэну вакол двух сапернікаў. Нядаўна назіралі мы тое ў Польшчы на самаўрадавых выбарах. Калі сабе ўявіць, што 9 кандыдатаў выступала супраць Аляксандра Лукашэнкі, паказвае гэта, што ў грамадстве ёсць альтэрнатыва і то немалая. І гэта менавіта стала прычынай таго ўсяго, што здарылася ў Мінску вечарам 19 снежня. Супраціў народу быў бачны на вуліцах беларускай сталіцы. Дваццаць ці сорак тысяч народу паказала сваё незадавальненне рэжымам. Калі закон не дзейнічае як належыць, і калі на яго няма ўплыву, каб выказаць свой пратэст, трэба выйсці на вуліцу. Прымяненне сілы супраць свайго народа абазначае ігнараванне яго думкі, а арышт кандыдатаў на прэзідэнта ды супрацоўнікаў іх выбарчых штабоў — татальную непавагу да канкурэнтаў. Але ў Беларусі ўжо такое было — калі не ўдавалася народ запалохаць і падпарадкаваць, арыштоўвалі яго эліту, нават яе знішчалі дзеля святога спакою для дыктатарскай улады. Здзіўляе толькі, што гульня ў выбары ў дзесятым годзе XXI стагоддзя адбываецца на асновах 30-х гг. XX ст.

Лена ГЛАГОЎСКАЯ

Навагодніх і калядных свят больш за ўсё чакаюць дзеці. Гэта зразумела — менавіта тады ўсё навокал становіцца чароўным і незвычайным, а значыць — казачным. А паколькі дзяцінства гэта час, калі вельмі лёгка паверыць у якую заўгодна казку, то наўпроставым увасабленнем гэтай веры з'яўляюцца падарункі, якія прыносіць Святы Мікалай.

Праўда, калядным святамі казка не мусіць канчацца. І гэта справа ўжо дарослых распавядаць дзецям пра нейкія дзівосы і чараўніцтвы, добрых і злых чараўнікоў, а таксама іншых казачных персанажаў, якіх толькі можна знайсці ў розных кнігах для чытання дзецям.

У 2010 годзе на прасторах Байнэта з'явіўся неблагі сайт, які аблягчае пошук бацькам беларускіх казак, кніжкі з якімі насамрэч не надта лёгка знайсці ў кнігарнях. Месціцца гэты сайт па адрасе http://vyaselka.ru і носіць назву „Вершы для дзяцей". Праўда для вершаў там адведзена толькі адна рубрыка, у той жа час як для казак — дзве.

Галоўная старонка сайта выглядае як вопратка добрай дзіцячай кніжкі. Дзіўныя казачныя персанажы, дамок, вялікія кветкі, блакітнае неба з белымі аблокамі адразу ўздымаюць настрой, выклікаюць прыемную ўсмешку і зацікаўленне. І гэта адбываецца таксама з-за таго, што падобных беларускамоўных сайтаў у інтэрнэце не надта многа.

На галоўнай старонцы месціцца своеасаблівае вітанне да наведвальнікаў вершавана-казачнага сайта. „Калі ўпершыню вы пачулі казку? — пытаюцца невядомыя яго ўладальнікі. — Наўрад ці ўспомніце дакладна, але несумненна — у дзяцінстве. Маці, бабуля, бацька, выхавацель дзіцячага сада чыталі, часцей, відаць, расказвалі іх, напаўняючы дзівоснай таямнічасцю свет. Мара і цуд раптам станавіліся побач з намі, з'ядноўваліся ў вядомых і загадкавых персанажах, якія засталіся на ўсё жыццё носьбітамі тых або іншых якасцей, — злосці ці дабра, здрады ці сяброўскай вернасці, зайздрасці ці справядлівасці. Вось чаму не існуе казак «сучасных» і «несучасных», бо ўсе яны аб вечных ісцінах, агульначалавечай маралі".

Што тычыцца рубрык сайта, то на першы погляд іх не надта многа — літаральна шэсць пад назвай партала і тры ўверсе. Але ў рубрыцы „Аўтары" можна трапіць на асобныя старонкі кожнага з паэтаў ці пісьменнікаў, творы якіх месцяцца ў „Вершах для дзяцей".

Старонка „Вершы" змяшчае вялікую колькасць вершаў на беларускай і рускай мовах. Нейкага тэматычнага парадку, у якім яны размешчаны, не прасочваецца. Гэта можна залічыць да недахопаў сайта, бо звычайна чытачы шукаюць творы на патрэбную ім тэматыку.

Далей ідзе рубрыка „Беларускія казкі". Іх не так ужо і многа, але яны невялікія па памерах і таму лёгка будуць успрымацца малымі дзецьмі.

Рубрыка „Казкі народаў свету" таксама змяшчае тэксты на беларускай і рускай мовах. Казак тут яшчэ менш, чым на папярэдняй старонцы, але не гэта з'яўляецца недахопам. Калі распрацоўнікі сайта кажуць пра іншыя народы, то натуральна было б пазначыць, якому з іх належыць тая ці іншая казка.

Ёсць на сайце і рубрыка „Апавяданні". Яна больш пасуе для самастойнага чытання дзяцей старэйшага ўзросту.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Контуры 2011 года

2011 год — не алімпійскі, няма ў няцотныя гады і буйных футбольных форумаў. Але прыхільнікам спорту зусім не будзе сумна. Прадставім у гэтым выпуску асноўныя контуры сезона.

У студзені пройдзе чарговы розыгрыш так званага Кубка Садружнасці па футболе ў Маскве. Турнір гэты цэлы час траціць свой прэстыж. Прадстаўляць Беларусь на гэты раз у прамым сэнсе выпхнулі салігорскі „Шахцёр". Куды з большым інтарэсам заўзятары будуць чакаць лютаўскіх баталій Лігі Еўропы, дзе барысаўскі БАТЭ пазмагаецца з французскім сталічным „Пары Сен-Жэрмен". Ну а сакавік стане момантам ісціны ўжо для нацыянальнай футбольнай дружыны — зборная Бернда Штанге ў адборавым матчы да кантынентальнага першынства пазмагаецца 26 сакавіка ў Тыране з Албаніяй. У чэрвені яна дома прыме Францыю і Люксембург. З вялікім нецярпеннем будуць чакаць заўзятары і фінальнага турніру моладзевага чэмпіянату Еўропы для гульцоў да 21 года, які пройдзе з 11 па 25 чэрвеня ў Даніі. Трэці раз у гісторыі беларуская каманда будзе прадстаўлена на такім топ-турніры, дзе сустрэнецца ў групе з камандамі Ісландыі, Даніі і Швейцарыі. У зборнай Георгія Кандрацьева ёсць унікальная магчымасць здабыць і пуцёўку на лонданскую алімпіяду. Для гэтага ў залежнасці ад сітуацыі трэба будзе мінімум выйсці ў паўфінал.

Працягнуцца ўсе хакейныя турніры бягучага сезона. У беларускай экстралізе галоўная сёлетняя інтрыга — ці здолее хто-небудзь скласці канкурэнцыю чэмпіёну апошніх гадоў сталічнаму „Юнацтву". Пакуль найбольш важкую заяўку на гэта робіць гродзенскі „Нёман", які ідзе на другой пазіцыі і адарваўся ад пераследнікаў. У заакіянскай НХЛ працягнем сачыць за выступамі беларускіх легіянераў. Пакуль „Дэтройт" Руслана Салея, „Манрэаль" Андрэя Касціцына ўпэўнена крочаць у плэй-оф Кубка Стэнлі, „Нэшвіл" Сяргея Касціцына боўтаецца на мяжы запаветнай рысы, а вось „Таронта" Міхаіла Грабоўскага асеў на дне. Тым большая верагоднасць выступлення таленавітага форварда ў складзе беларускай дружыны на 75-ым чэмпіянаце свету, які пройдзе ў красавіку-траўні ў Славаччыне. Там яе сапернікамі на першым этапе ў горадзе Кошыцы будуць Канада, Швейцарыя і Францыя. Мінскае „Дынама" сваім парадкам у Кантынентальнай хакейнай лізе мусіць па-ранейшаму даводзіць мэтазгоднасць свайго ўдзелу ў гэтым праекце. І далёка не факт, што пераканае ў ёй. Занадта ж ужо моцна яго зараз „кілбасіць".

Заўзятараў біятлона чакаюць чарговыя этапы Кубка свету — у студзені яны адбудуцца ў нямецкіх Оберхофе і Рупольдынгу, а таксама ў італьянскай Антэрсельве, у лютым „караван" пераедзе за акіян у ЗША, а ў сакавіку ўсё завершыцца чэмпіянатам свету ў Ханты-Мансійску і заключным этапам у нарвежскім Холменколене. На беларускіх мужчын надзея слабая, а вось Дар'я Домрачава напэўна будзе прэтэндаваць не на адзін п'едэстал, а магчыма і змагацца за кубак у агульным заліку. З іншых зімовых відаў вялікую цікавасць у беларусаў выклікае фрыстайл, а менавіта лыжная акрабатыка. Галоўнае пытанне — ці здолее пацвердзіць свае прэтэнзіі Антон Кушнір, уладальнік Вялікага крыштальнага глобуса мінулага сезона, які, аднак, пацярпеў прыкрае фіяска на алімпіядзе.

Тэнісны сезон распачнецца ўжо ў студзені традыцыйным адкрытым чэмпіянатам Аўстраліі. А ўвогуле прыхільнікаў спорту чакаюць як звычайна чэмпіянаты свету і Еўропы ў разнастайных, менш папулярных відах спорту.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Няпросты 2010-ты (2)

А цяпр давайце прыглянемся важнейшым падзеям у 2010 годзе. Мінулы год, год тыгра, распачаўся прыгожа навагодняй ноччу: вакол ляжаў белы-белы снег, тэмпература ў межах пяці-шасці градусаў марозу. І менавіта такім павінен быць пачатак новага года.

Новы год мы з жонкай правялі традыцыйна дома, з дачкой, зяцем і ўнукамі. На першы і другі дзень хадзілі мы з хлопчыкамі ў парк і з'язджалі там на санках з заснежанай горкі. Было там крыку, смеху і нават плачу, бо другі наш хлопчык далічыўся, што ён з'ехаў з горкі менш разоў, чым яго брат. А такой несправядлівасці яны не пераносяць. Хлопчыкі з бацькам пакупаліся таксама ў нашым гайнаўскім новым прыгожым басейне.

Праваслаўнае Раждзяство таксама праходзіла пад знакам прыгожай зімовай пагоды — на зямлі і на дрэвах ляжаў снег і амаль з кожным днём яго яшчэ прыбывала, было ў меру марозна. І так аж да паловы лютага. Значыць, нарэшце зіма была ў згодзе са старой тутэйшай традыцыяй — Новы год з марозам, Каляды з марозам, Вадохрышча таксама. Падобна было і са снегам — як на Новы год выпаў, так аж да паловы лютага ўсё падсыпвала яго і падсыпвала. У палове лютага таўшчыня яго дасягала ўжо сантыметраў 60-65. Пад яго цяжарам ламаліся дрэвы і дахі, былі засыпаны-завалены дарогі, вуліцы, паркі і лес, замярзалі насмерць людзі. Цяжка было змагацца з такім снегам. Тэмпература ўвесь час была нізкая, часам да трыццаці і больш градусаў ніжэй нуля. Першы раз паднялася яна вышэй нуля 18 лютага. І ад гэтага часу суровая зіма пачала памаленьку здаваць свае пазіцыі: тэмпература лагаднела, снег асядаў, траціў сваю бель, раставаў і расплываўся...

Да гэтай халодна-белай зімы я ніякіх прэтэнзій не маю. Можа таму, што ў самае халоднае і снежнае надвор'е не мусіў выходзіць з дому, а прыгажосць яе аглядаў з акон сваёй цёплай кватэры.

У сакавіку снег у горадзе і пушчы пачаў незаўважальна прападаць, нават большых лужын па сабе не пакінуўшы. Вясна аднак была сырая, даволі халодная і спозненая. Пасевы ярыны і агародніны былі таксама спозненыя і часта садзілі і сеялі проста ў балота. Гэтыя нявыгады сталі пачаткам вялікіх бед і няшчасцяў.

Дзесятае красавіка стала проста чорнай датай для польскага народа і дзяржавы. Самалёт з прэзідэнцкай парай, міністрамі, дэпутатамі, сенатарамі, генералітэтам і духавенствам (96 чалавек), ляцеўшых на Катынскія могілкі ў сувязі з сямідзесятай гадавінай расстрэлу польскіх афіцэраў, пацярпеў катастрофу. Усе паломнікі загінулі...

Здавалася б, гэтая катастрофа павінна нарэшце з'яднаць народ і навучыць яго хрысціянскай пакоры. Але не з'яднала і не навучыла, а наадварот — яшчэ больш раз'яднала і больш нахабным зрабіла. Астаўшыеся ў жывых палітыкі адзін перад адным аж са скуры лезуць, каб як найбольш зарабіць асабістай і партыйнай карысці на гэтай трагедыі. І гэта няпраўда, што ім так хочацца як найхутчэй выкрыць прычыну катастрофы самалёта — бо чым тады яны карміцца будуць? А калі ўжо выкрыць, то напэўна не аб'ектыўную прычыну, а толькі такую, якая ім выгадная. Аж слухаць гадка...

І так кончыўся май. Быў ён надта капрызны бо халаднаваты і вельмі мокры. Многія рэкі выступалі з берагоў і затаплялі ўсё новыя і новыя мясцовасці. Гінулі людзі і іх маёмасць, расплываліся пагоркі, развальваліся будынкі, панаваў страх. Такой магутнай паводкі не было ў нас падобна больш за сто гадоў. Неспрыяльным ён быў таксама палявым і агародным работам, адпачынку і ўсёй сельскагаспадарчай прадукцыі. Адным словам замнога няшчасця здарылася ў гэтым паўгоддзі ў нас. А ў нашай дзяржаўнай палітыцы штораз мацней разгаралася прэзідэнцкая выбарчая кампанія і спрэчкі на тэму хто вінаваты ў смаленскай катастрофе.

З пачатку чэрвеня яшчэ было халаднавата, часценька ішоў дождж, было сыра. І не дзіва, што паявіліся першыя грыбочкі ў пушчы, а ў мяне дома смакавітыя грыбныя супчыкі. А на поўдні Польшчы надалей проста катастрофа. І такі стан пратрымаўся там яшчэ доўга. Хто ў гэтым вінаваты? Напэўна выбрык натуры, і перад ім поўнасцю забяспечыцца проста немагчыма. Вельмі добра, што такія анамаліі бываюць даволі рэдка. Але былі напэўна і занядбанні мясцовых улад і адпаведных службаў. Яны, як часценька ў нас бывае, відаць, паспадзяваліся на рускае „авось". Каб не было зусім сумна нам, зараз потым прыйшла да нас спякота на градусаў трыццаць і больш. З чаго таксама не ўсе былі задаволеныя. Вось і дагадзі ты народу. На шчасце, мае сямейнікі не наракалі на ўсе гэтыя анамаліі...

Вось колькі бед і няшчасцяў звалілася на нашу краіну толькі за паўгода. Што ж рабіць і як жыць, каб не дапусціць да наступных?

Да важнейшых сямейных падзей першага паўгоддзя трэба залічыць нараджэнне маёй унучкі, заканчэнне прадшколля меншым унучкам і заканчэнне першага класа пачатковай школы старэйшым. Перад заканчэннем прадшколля журналісты правялі інтэрв'ю з дзеткамі ўнукавай групы. У ім маюцца адказы і майго ўнучка Васілька. На пытанне „Jak najlepiej odpoczywać po pracy?" — „Emerytura!" — запрапанаваў ён. „Jak będziecie odpoczywać w czasie wakacji?" — „Pojadę do dziadka i będę łapać stonkę na działce...".

(працяг будзе)

Васіль САКОЎСКІ

Сход у Барысаўцы

Андрэй ЯЛОЗА

У Барысаўцы Гайнаўскай гміны 17 снежня 2010 г. адбыўся агульнавясковы сход для выбару солтыса новага склікання. У сходзе прысутнічалі 44 жыхары Барысаўкі, Галяковай Шыі і Альховай Кладкі, радная Агнешка Янюк і інспектар Гміннай управы Ірэна Ежык. Спадарыня інспектар паінфармавала сабраных аб мэце сходу, затым старшынёю сходу сабраныя выбралі Агнешку Янюк.

Былы солтыс Ян Яканюк коратка расказаў пра сваю дзейнасць у мінулым скліканні. У кандыдаты на солтыса вылучыліся Ян Яканюк і Галена Сцепанюк. У выніку тайнага галасавання солтысам быў абраны Ян Яканюк, які атрымаў 31 голас. У Салэцкую рады ў тайным галасаванні былі выбраны Марыя Секаноўская, Барбара Анішчук, Анна Шарэйка і Мікалай Паўлючук.

Пасля заканчэння выбарчай працэдуры сабраныя прад'явілі ў адрас гмінных улад чатыры прапановы: пакласці асфальт на дарозе ў Альховую Кладку, пракласці каналізацыю, пашырыць і выраўнаць палявыя дарогі, раз у год арганізаваць вясковы сход з удзелам войта Гайнаўскай гміны.

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клетцы роспісу, складуць рашэнне — пагаворку.

1. мільённая доля тоны = 16 _ 5 _ 2 _ 9 _;
2. партнёрка цела = 12 _ 1 _ 8 _ 13 _;
3. між узводам і батальёнам = 14 _ 15 _ 11 _ 10 _;
4. высокая і акруглая капа сена = 3 _ 4 _ 6 _ 7 _.

					1
2	3	4	5	6	7
		8	9	10	11
	12	13	14	15	16

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 49 нумара

Дынама, калач, магія, пух, Пуцін, рэха, хан, цынік, чума, шал, Юлія.

Рашэнне: **У адных рэлігіях пакланяюцца мучанікам, у іншых палачам.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Лявону Федаруку** з Рыбал.

09.01 — 15.01

(22.03. — 20.04.) Адораны будзеш баявітасцю, адчаем і вялікай сілай пераконвання. Зможаш зрабіць многа! Не сядзі ў куце, бяры руль жыцця ў свае рукі! Перад табою адкрываецца свет. Можаш выбрацца ў далёкае ці карацейшае падарожжа. А хатнія справы цякуць памаленьку, спакойна, аж да 19.01.

(21.04. — 21.05.) Цягнуць цябе будзе ў розныя экзатычныя куткі. Спазнаеш іншае, навучышся новаму. Сур'ёзна падыдзеш да справы пачуццяў. Фінансавы ніз, ды вернуцца нейкія грошы. Можаш сустрэць мудрага чалавека, які падштурхне цябе да дзейнасці.

(22.05. — 22.06.) 8-12.01. лёгка наладзіш кантакты з асобай, на якой табе залежыць, на сустрэчы заззяеш інтэлігентнасцю, пачуццём гумару. 9-13.01. не дай сябе ўвесці ў інтрыгу на месцы працы. Работа работай, ды не забудзь пра забаву.

(23.06. — 23.07.) 9-13.01. убачыш канкрэтныя вынікі сваёй працы. Будзь спакойны за свой кашалёк. Калі не ўмееш танцаваць, запішыся на курсы. Шчаслівы час для кахання. Найбольш зразумення атрымаеш ад Рыб і Скарпіёна. Маеш асабліва добры год для хатніх спраў.

(24.07. — 23.08.) Мільія хвіліны, асабліва з найбліжэйшымі. Калі лішне ўзлезуць табе на галаву, тупні нагой! На працы таксама дамагайся свайго. У працы моцна развінеш крылы; пераканаешся, хто табе спрыяе. Не абмінай лекарскіх кабінетаў. Не коўзайся на вуліцы.

(24.08. — 23.09.) 8-12.01. адчуеш вялікі прыліў натхнення; можаш напісаць верш або... звязаць шалік. 9-11.01. твая кепская хвальба ўразіць; не дзяры носа. Вельмі падабаешся; можаш сустрэць абранніка! Будзеш танізаваць атачэнне, палагодзіш розныя справы. Не адмаўляйся ад прыемнасцей.

(24.09. — 23.10.) Вернецца табе радасць жыцця, з даверам глянеш у будучыню, з перашкодамі справішся ў секунду. Нуднавата ў пачуццях, лепш будзе ў наступным тыдні. Важных прафесійных спраў не рашай без кансультацыі з блізкімі. Не праспіш пару начэй, пакуль не абдумаеш, на чым табе залежыць.

(24.10. — 22.11.) Іншыя так танцуюць, як ім зайграеш. Нялёгка табе закрунуць у галаве, да пачуццяў падыходзіш сур'ёзна. На працы таксама мала хто цябе дагоніць, зможаш рабіць пару спраў адразу (дакладна!), справішся і ў крытычных сітуацыях. Не ўхваходзь у адкрыты канфлікт. Не турбуйся грашыма, калі нават твой кашалёк цяпер тоненькі.

(23.11. — 22.12.) З усяго, што цяпер цябе сустрэне, будзеш мець карысць, нават калі будзеш добра гуляць — нярэдка на гэтым заробіш. Адзінокія Стральцы пазбудуцца сваіх комплексаў. Адносіны з каханай асобай надта гарачыя. На працы не запавольвай тэмп, некаторыя справы перанясі на наступны тыдзень; думкі аб змене працы перасунь на трэцюю дэкаду студзеня.

(23.12. — 20.01.) Ясны агляд сітуацыі, цвярозы погляд гарантуюць табе поспех. Ты цяпер нялёгкі партнёр; схочацца падпарадкоўваць людзей. Большасць сілы перакінеш на прафесійны фронт, ды інтуіцыя і там — твой найбольшы козыр. Маеш шанц пазбыцца благіх звычак, прынамсі іх прытармазіць.

(21.01. — 19.02.) Многа ўражанняў і эмоцый. Добры настрой, ды не ўседзіш на месцы. Будзеш крыху эгаістам, у чым папракне цябе партнёр. 9-13.01. цяжка будзе табе рэальна ацэньваць сітуацыю, лёгка цябе цяпер абдурыць; неразважнае рашэнне можа пазбавіць цябе немалых грошай!

(20.02. — 21.03.) 10-14.01. удасца табе аформіць справу, на якую ты ўжо махнуў рукою. Прападуць перашкоды, пойдзеш уперад. Інтуіцыя цябе не падвядзе і накіруе адразу да мэты. Праца прынясе шмат прыемнасці; будзеш хуткі, дакладны, спакойны. Калі працуеш на ўласным, будзеш рады прыбыткам.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

Цуд маем закладзены ў генах!

Ганна КАНДРАЦЮК

http://wiadomosci.wp.pl
PAP / Wojciech Pacewicz

(пачатак у 52 н-ры)

Для паломніка шмат знакаў і прыкмет высвятляе надвор'е. Яно памятаецца гадамі, разам з усімі дэталямі і людзьмі сустрэнутымі ў дарозе. І нават зараз, калі ехалі мы на аўтобусе, сонечная аўра акрыляла душы. Снег і лёгкі марозік мацавалі настрой чысціні. Здавалася, невядома дзе зніклі чатыры гадзіны падарожжа. Спрацавала таксама сардэчнасць і ветлівасць грамады. І добры спакой, які напамінаў быццё па-за часам і месцам. На месцы, у славутым Тарэспалі, прыцаркоўны пляц быў застаўлены аўтобусамі, маршруткамі, легкавушкамі. На ранняй літургіі, спалучанай з малебнам, маліліся паломнікі з Чаромхі, Сямятыч, Бельска-Падляшскага. Для Беластока, адкуль прыехалі аж тры аўтобусы, арганізавалі асобны малебен і акафіст.

Нас прасілі пачакаць аж выйдзе першая змена, каб захаваць парадак і добрыя манеры. Аднак наш беластоцкі народ штурмам кінуўся ўсярэдзіну, каб чым хутчэй вуснамі дакрануцца цуду. Ніхто, у тым ліку ніжэйпадпісаная, не паслухалі добрых рад арганізатараў. Быццам усё мела скончыцца на вачах, знікнуць, абмінуць нас. Так дзейнічае звышэмацыйнасць ва ўмовах цудоўных здарэнняў. Напаміны тыпу *wszyscy zdążą* здаваліся падманам. Мне пашанцавала першыя дзесяць хвілін пастаяць у прытворку. Там, за дзвярыма, у непрыкметным куточку была свабодная прастора і стаялі два хлапчукі ў набожнай засяроджанасці. Яны застаўлялі думаць пра гімназіста Лукаша Паплаўскага, якому былі пасланы знакі з неба. У цэлым здарэнні найбольш уражвала мяне адна дэталь — малітвы гімназіста, якія кожнай раніцы гаварыў ён у сваім святым кутку ў хаце.

* * *

Афанасій Брэсцкі (у міры Філіповіч) праславіўся як абаронца праваслаўя. Падвергнуты здзекам і пагрозе смерці кінуў у твар сваім суддзям-езуітам: *Месца, дзе ляжа маё спакутаванае цела, зацвіце белымі лілеямі праваслаўнай веры.* Пасля смерці яго цела восем месяцаў знаходзілася ў невядомым месцы. Святога знайшлі жыхары Брэста, якіх уразіла нятленнае цела. Яны занеслі ігумена ў Свята-Сімяонаўскі манастыр і там пахавалі яго з належнай пашанай. Над магілай мучаніка Афанасія, згодна з запаветам, людзі па сённяшні дзень атрымліваюць аздараўленні, мацуюцца ў веры і пастановах. Афанасій Брэсцкі пражыў няпоўныя пяцьдзесят гадоў. Нарадзіўся ён у 1596 годзе, калі была ўведзена Брэсцкая ўнія, з якой ніколі не прымірыўся, ваяваў і загінуў. З сённяшняй перспектывы напамінаў палітыка. Натхнёны акафістам да Купяціцкай Божай Маці (служыў некалькі гадоў у Купяціцкім манастыры каля Пінска), паехаў на сойм выказаць свой пратэст супраць знішчэння праваслаўя. Свой супраціў накіраваў таксама каралю. За непахіснасць і прынцыповасць неаднойчы быў кіданы ў турму. Яго пераследнікаў да крыві хвалявала, што *унію* паўсюдна і адкрыта называе *праклятай*, а праваслаўе — святой верай. Жыццё і змаганне Афанасія Брэсцкага сімвалічна канчае адраджэнскі беларускі век, які ў вялікай меры сфармаваўся ў выніку мірнага сутыку культуры Візантыі і Еўропы. Як вядома, першую друкаваную царкоўную кніжку для ўсходніх славян выдаў у 1517 годзе беларус Францішак Скарына ў Празе. Сто пяцьдзесят гадоў пасля агіяграфія мучаніка за веру Афанасія Брэсцкага была напісана на польскай мове. Гэта паказвае як вялікія змены адбыліся на беларускіх землях.

У пачатку XXI стагоддзя, калі Беларусь ірвецца ў Еўропу, ікона з Афанасіем Брэсцкім пачала міраточыць. Быццам прамаўлялі яго святыні, якія, цудоўна захаваныя, знаходзяцца па другім баку ракі ў Брэсце. Сам Тарэспаль у пэўны момант успрымаўся як квартал слаўнага горада Брэста, а ў царкве, у якой міраточаць іконы, маліліся салдаты вайсковых часцей.

* * *

Настаяцель Яраслаў Лось прывітаў нашу групу са ззяючым тварам. Здавалася, кожны куточак царквы прасякнуты атмасферай цудоўнага здарэння, якая адчуваецца кожнай часцінкай цела. Ад радасці сустрэчы з месцам хацелася проста плакаць. Пра гэтую акалічнасць гавораць многія паломнікі, якія наведалі Тарэспаль. Дадаткова натхняла натуральнае святло, якое золата-малочнай хваляй улівалася праз вокны. Натуральныя праменні падсвятлялі іканастас у аранжава-карычневых колерах. Святло вылівалася з-за царскіх варот, ад алтара. Калі ў цеснай чарзе я „падплыла" (бо так цёткі націскалі ад заду) да міратачывай іконы ў правым кутку іканастаса, я адчула нешта бы божы спалох. І толькі калі ставіла свечку перад іконай я прыкмеціла, што ад узрушанасці дрыжаць ногі і рукі. За гэтую акалічнасць я, зразумела, падзякавала продкам, якія перадалі здольнасць перажываць цуд.

Праўда, сапраўдны паломнік, каб адчуваць сябе ганарова, не павінен ехаць з пустою кішэняй. Амаль кожны купіў па дзве-тры іконкі (па 10 і па 20 злотых), якія мірам ад ікон пазначыў свяшчэннік. Мусова таксама выдаць 10-50 злотых на свечкі, бо, будучы ў такім месцы і часе, нельга забывацца пра сямейку, заплаціць за малебен, у ходзе якога чытаюць імёны, пададзеныя на спецыяльнай картцы.

* * *

Паездка ў Тарэспаль натхніла мяне добрым спакоем. Калі ў тры гадзіны вечара мы селі ў аўтобус, каб вяртацца дамоў, мне стала зрозумела, што не паспею вярнуцца на час у Беласток. Апошняя акалічнасць зусім не хвалявала. У вушах звінела яшчэ натхнёная пропаведзь нашага духоўнага апекуна. Штосьці незразумелага дзеялася з часам. Хвіліны і гадзіны, здавалася, расцягнуліся ў часе. У Беласток прыехалі за дзве з паловай гадзіны. У доказ прызнання і падзякі пану Кшыштафу, нашаму шафёру, паломнікі падзякавалі гучнымі апладысментамі. Адразу пасля прыезду я пайшла на бенефіс паэта-прафесара Алеся Барскага. Да майго выступлення заставалася яшчэ пятнаццаць хвілін. Якраз столькі, каб пераапрануцца і аддыхацца. Пасля, калі пра паездку ў Тарэспаль і ўражанні я расказала знаёмым, яны адразу спыталі:

— А якім цудам ты паспела вярнуцца?

(працяг будзе)

ISSN 0546-1960